PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl

№ 49 (2430) Год XLVII | Беласток, 8 снежня 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Мелі „Рацыю”

Зося Лемеш

Нешта ў свеце, вясна ці зіма,
грошай няма і настрою няма...

Была вясна... Позняя, цёплая вясна 2002 года, першы дзень чэрвеня. Гэтага дня, амаль зусім нечакана, у месцы перадач Радыё „Рацыя” з'явілася цішыня. Цяжкая цішыня, якую нельга было стрымаць самому. Таму сабраліся мы, як кожны тыдзень, на рацыйным чаце Пляткарня. Стэп і іншыя журналісты ў студыі па вуліцы Цёплай у Беластоку і мы — слухачы з Беластока, Бельска, Гайнаўкі і Кракава перад сваімі камп'ютэрамі — стварылі супольны фронт абароны. Не маглі, не хацелі мы паверыць, што НАШАЕ радыё можа проста знікнуць. Не хацелі здавацца. У гэты час найбольшае ўражанне зрабілі на мяне Лукаш Сцепанюк і Тамаш Снарскі, якія стварылі малады калектыў Радыё „Рацыя” і, хаця не даставалі за тое зарплаты, вялі аўтарскія перадачы „Балкон Рацыі”. Стэп сядзеў у студыі, а Снарэк на балконе і адтуль распавядаў аб навакольных падзеях, напрыклад аб пешаходах ці аб каце, якога нехта прывязаў да дрэва... Перадачам спадарожнічала самая актуальная тады музыка, між іншым, альбом „Крамбамбуля”. Слухачы прымалі актыўны ўдзел у перадачах, што магло здзіўляць у такіх умовах — радыё ўвесь час вяшчала механічна, але калі толькі паяўляўся жывы эфір, людзі пачыналі тэлефанаваць. Не трэба было нават падаваць нумары. Снарэк расказваў, што калі ўжо ў студыі выключылі тэлефоны, ён падаў нумар свайго мабільніка. Людзі яшчэ пару дзён тэлефанавалі, каб заказаць песні і паразмаўляць... Цікава, што толькі тых двух ідэалістаў засталіся тады пры „Рацыі”...

Было лета... Пачало мяне цікавіць, ці хто-небудзь слухае яшчэ такое „мёртвае” радыё, дзе, праўда, ёсць папулярная музыка, але не хапае „чалавечнасці”. Мела я вялікія сумненні. Аж аднойчы мой бацька пачуў у краме, як старэйшае сужонства пытала ў прадаўца: „Маеце добрыя радыёпрыёмнікі? Бо наш стары то ўжо да нічога! Што мы з ім не рабілі, нават новую антэну паставілі, а Радыё „Рацыя” не чуваць! Да суседзяў трэба хадзіць слухаць”.

Была восень... Радыё ажыло на пару дзён, на жаль, толькі з прычыны выбараў. Адазваліся іншага роду ідэалісты, адазваліся і на іншай мове (па-польску!). Самае важнае, што некаторым ім у выбарах пашанцавала. Толькі што „Рацыя” зноў заціхла...

Тым часам на гасцёўні Радыё „Рацыя” АРА піша: „Wolna Europa ёсць, а вольнае Радыё „Рацыя” — калі будзе? Смутак вялікі ў маім доме. РР нас не вітае „live”. Вялікае шчасце, што мы нешта нагрывалі! :-)”

[працяг ☞ 2]

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Падвядзенне вынікаў VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы. З дакладам выступае д-р Янка Трацяк (Беласток, 9.11.2002 г.).

„Паласатая” літаратура

Янка Трацяк

Творчасць самадзейных аматараў літаратуры — удзельнікаў штогадовага Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы — цяжка трактаваць з гледжання літаратурнай крытыкі. Зразумела, лягчэй за ўсё даць адмоўную адзнаку і паставіць на гэтым кропку, але хацелася б звярнуць увагу на некаторыя асаблівасці, якія істотна ўплываюць на творчы працэс канкурсантаў і, часам, зводзяць гэты працэс да звычайнага тупання на месцы. Калі чытаеш творы, якія пададзеныя на конкурс, напачатку складваецца кантрастнае ўражанне: добры твор — кепскі твор, паводле вядомага выказвання: „Жыццё, што зебра: то светлая паласа, то цёмная”, але пры больш падрабязным разглядзе прыходзіцца пагадзіцца з тым, што большасць твораў з'яўляецца шэрымі, альбо і зусім бясколернымі. Аўтарам такіх твораў цяжка даць якую-небудзь канструктыўную параду. Калі ж гутарка ідзе пра пачаткоўцаў, то гэта нармальны працэс. Іх можна зразумець: ім хочацца пісаць, але яны не ведаюць, як пісаць і пра што пісаць. Ім не трэба баяцца, што першыя іх „сачыненні” могуць застацца незаўважанымі. Калі ж праца будзе працягвацца ў творчым пошуку, у іх з'явяцца свае тэмы, свае сродкі выяўлення, свой стыль, свой „почырк”. Тым не менш, ёсць і светлыя „палосы”, якія не засталіся па-за ўвагай конкурснай камісіі, на што, дарэчы, і звернем свой суб'ектыўны погляд.

Галоўны крытэрый, якога звычайна прытрымліваюцца сябры журы літаратурнага конкурсу пры ацэнцы творчасці моладзі — гэта выяўленне аўтарамі свайго ўспрыняцця свету, свайго бачання, няхай сабе і наіўна-дзіцячага, але шчырага і тым адметнага, праўда, з адной агаворкай, — калі гэта светабачанне ўвасобленае ў адпаведныя літаратурныя вобразы і формы. Характэрным, у гэтым сэнсе, можа быць верш Радаслава Мацієвіча „Пра дажджавога чарвячка”, у якім відавочны падзел пазнання свету: чарвячком, які называўся Кароль, дарослым, маленькім (аўтарам), які па-своему дае адказ на пытанне, чаму Кароль „схаваўся ад людзей пад зямлю”. Такім чынам, вобраз атрымлівае завершанасць і паэтычную закончанасць. Дабавіць штосьці да гэтага сюжэта немагчыма. Іншая справа з вершам Паўліны Нічыпарук „Чатыры”:

Магічнай лічбай ёсць чатыры,
Бо для мяне яна злучаецца
З чатырма сценамі,
Якія прыпамінаюць хату,
А хата гэта месца сямейнага цяпла.

Абмежавалася Паўлінка толькі сценамі хаты, але гэтыя сцены куды б выглядалі даражэй і мілей за ўсё на свеце, калі б у пераліку магічнай лічбы ім папярэднічалі чатыры напрамкі свету, альбо чатыры стыхіі (зямля, вада, паветра, агонь), — тады верш набыў бы філасафічнае гучанне і касмалагічную завершанасць, але толькі хата можа быць месцам сямейнага цяпла. З другога боку, хату, як устойлівы вобраз, можна разглядаць і як архетып культуры. Як тут не згадаць кнігу Янкі Сіпакова „Усе мы з хат”. Заўвагі нашы гучаць не ў якасці дакору — не карэктным было б іх рабіць за тое, чаго няма. Хацелася паказаць магчымыя варыянты інтэрпрэтацыі вобразаў магічнай лічбы і хаты, балазе да гэтых вобразаў звярнулася Паўліна Нічыпарук.

[працяг ☞ 5]

Не кааліцыя, а пагадненне ☞ 3

Пагадненне аб супрацоўніцтве ў самаўрадах Гайнаўкі і Гайнаўскага павета падпісалі Гайнаўская павятовая ўправа СЛД і Беларускі народна-выбарчы камітэт. У кожнага камітэта выбаршчыкаў ёсць свае праграмы і важныя справы. Аднак для рэалізацыі праграм трэба мець падтрымку большасці радных.

Беларускі камунізм ☞ 4

У архіўных дакументах захоўваюцца доўгія спіскі арыштаваных за камуністычную дзейнасць таксама на Беласточчыне. Кожнага году ў кожнай гміне замыкалі дзесяткі чалавек, раней прапусціўшы іх цераз следчы апарат, які быў значна больш дакучлівы чым шматгадовае зняволенне. Паліцыя дарогай псіхічнага і фізічнага тэрору імкнулася прымусіць іх прызнацца ў палітычным злачынстве.

З глыбі (гарадоцкага) сэрца ☞ 8

Ідэя прэзентацыі гарадоцкіх майстроў слова шырэйшаму колу жыхароў гміны ўзнікла ў снежні 2000 г. Сябры, згуртаваныя ў літаратурнай групе „Каласы” мелі публікаваць свае творы на старонках „Гарадоцкіх навін”. Аднак прабіцца на старонкі мясцовага часопіса ўдалося нешматлікім.

За незалежнасць — да канца ☞ 9

Уладзімір Жылка свядома працягваў місію Багдановіча. Будаваў масты паміж беларускай глухаманню і еўрапейскім парнасам. На працягу кароткага жыцця праявіўся як паэт, літаратурны крытык, перакладчык, рэдактар часопісаў, грамадскі і палітычны дзеяч, настаўнік.

Юбілей „Цаглінак” ☞ 9

На працягу сваёй 25-гадовай дзейнасці ляўкоўскія „Цаглінкі” заваявалі сэрцы шырокага кола аматараў музыкі. Калектыў — шматразовы лаўрэат конкурсаў. У яго рэпертуары вялікая колькасць песень. Калектыў выпусціў аўдыёкасету з запісам найбольш яркіх сваіх мелодый. Усе яны выконваюцца і задушэўна, і звонка, і мілагучна.

Трымае нас толькі запал ☞ 10

Раней, перад трансфармацыяй, за адзін сезон наш цырк наведваў 14 гарадоў. У адным горадзе стаялі мы два тыдні або месяц. Тады ў горад прыязджалі людзі з вёсак і мястэчак, а сёння маецца наадварот. І паменшаў лік гледачоў, нягледзячы на тое, што мы ездім у малыя мясцовасці, такія як Орля.

Беларусь — беларусы

Пятро Кузьміч не хоча вярнуцца ў Беларусь

Беларускае Міністэрства замежных спраў пацвердзіла інфарамацыю, што былы пасол Рэспублікі Беларусь у Токіо Пятро Кузьміч Краўчанка адмовіўся вярнуцца на радзіму пасля заканчэння сваёй дыпламатычнай місіі ў Японіі. Паводле прэс-сакратара МЗС Паўла Латушкі, Краўчанка адмовіўся выканаць загад знешнепалітычнага ведамства і не вярнуўся на радзіму. У даны момант міністэрства не распараджаецца інфарамацыяй аб месцы прабывання экс-пасла і не мае з ім кантакту.

— З дапамогай Міністэрства замежных спраў Японіі будзем намагацца ўстанавіць з ім кантакт, такія меры ўжо прымаюцца, — заявіў Павел Латушка.

Раней паведамлялася, што Краўчанка прапаў у Токіо. 30 лістапада вечарам сведкі бачылі як ён уязджаў на тэрыторыю пасольства ЗША ў Токіо, а пасля след па ім прапаў. Амерыканскае пасольства ў Токіо заявіла, што яно „не распараджаецца інфарамацыяй" аб знікненні былога пасла Беларусі.

Усе спробы наладзіць кантакт з паслом, які ў Токіо выконваў сваю місію з 1997 г. да лістапада 2002 г. аказаліся безвыніковымі.

Паводле агенцтва Інтэрфакс, экс-пасол у момант знікнення меў пры сабе грошы, якія належалі пасольству, афіцыйныя дакументы і пячатку дыпрадстаўніцтва.

19 лістапада прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вызваліў Пятра Краўчанку з пасады пасла ў сувязі са скончэннем паўнамоцтваў.

Паводле агенцтва ІТАР-ТАСС, многае паказвае на тое, што Пятро Краўчанка, у мінулым (да 1994 г.) шматгадовы міністр замежных спраў Беларусі, належыць да групы апазіцыйных у адносінах да Аляксандра Лукашэнкі палітыкаў.

ПАП, 1.12.2002 г.

БАЖ узнагароджаны „Залатым пяром свабоды — 2002"

Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) узнагароджаная прэміяй „Залатое пяро свабоды — 2002" Сусветнае асацыяцыі газет. Гэтае рашэнне абвешчана 26 лістапада падчас сустрэчы сяброў САГ у Маскве.

Сусветная асацыяцыя газет са штабкватэрай у Парыжы прадстаўляе інтарэсы 18 000 газет. Яна аб'ядноўвае 71 нацыянальную газетную асацыяцыю, індывідуальных выдаўцоў у 100 краінах свету, 13 інфармацыйных агенцтваў і 9 рэгіянальных і сусветных аб'яднанняў, якія працуюць у сферы СМІ, перадае http://www.belapan.com.

Як паведамляецца ў распаўсюджанай асацыяцыяй заяве, „Залатое пяро свабоды" — штогадовая прэмія ў галіне свабоды прэсы ганараваная САГ. БАЖ атрымала гэтую ўзнагароду „за мужны супраціў рэпрэсіям беларускіх уладаў адносна сродкаў масавай інфармацыі". Рада САГ прызнае „важную ролю Беларускай асацыяцыі журналістаў у садзеянні развіццю свабоды прэсы перад сталымі праследамі". Многія з 900 сябраў асацыяцыі арыштоўваліся, збіваліся і шмат разоў цярпелі пераслед. Калі б не супрацьстаянне гэтай арганізацыі, свабода слова і інфармацыі была б цалкам ліквідаванай", — гаворыцца ў заяве САГ. Прадстаўнікі Сусветнай асацыяцыі газет звярнуліся да прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з просьбай „спыніць рэпрэсіі да свабоднай журналістыкі". Цырымонія ганаравання запланаваная на чэрвень 2003 года. Яна пройдзе ў Дубліне (Ірландыя) у рамках Сусветнага кангрэса газет і форуму дырэктараў, а таксама выставы „Инфосервис-2003".

Навіны Хартыі '97, 27.11.2002 г.

Новыя ваяводскія ўлады

Радныя Сейміка Падляшскага ваяводства 26 лістапада 2002 г. на першай сесіі пасля самаўрадавых выбараў выбралі Збігнева Кшывіцкага (СЛД) новым старшынёю Сейміка. Намеснікам старшыні сталі: Адам Дабронскі (ПСЛ), Антоні Цізоцкі (Самаабарона) і Славамір Згжыва (ПОПіС). 54-гадовы старшыня З. Кшывіцкі па прафесіі журналіст і апошнія 12 гадоў выконваў мандат гарадскога і ваяводскага раднага.

Выбраны быў таксама маршалак ваяводства. Стаў ім Януш Кшыжэўскі (СЛД) — эканаміст па прафесіі, прадпрымальнік з Сувалкаў, радны Сейміка папярэдняга склікання. На гэтай жа сесіі Кшыштаф Талвінскі (ПСЛ) быў выбраны віцэ-маршалкам, а Караль Тыленда (Самаабарона) — членам Управы ваяводства.

На другой сесіі 30 лістапада радныя віцэ-маршалкам ваяводства выбралі Яна Камінскага (Самаабарона), а членам Управы ваяводства — Яна Сычэўскага (СЛД), старшыню Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

www.sejmik.bialystok.pl

Подпісы за свабоду слова

У амбасаду Беларусі ў Польшчы 24 лістапада г.г. былі перададзены паўтары тысячы лістоў пратэсту супраць знаходжання за кратамі журналістаў і закрыцця незалежных газет, падпісаных жыхарамі Польшы да прэзідэнта Беларусі.

З заклікам збору подпісаў „Газета выбарчая" звярнулася да сваіх чытачоў напачатку кастрычніка. Да акцыі „Выбарчай" далучылася таксама тэлекампанія „Polsat", дзе былі паказаны сюжэты пра гродзенскіх журналістаў.

— Дзякуючы гучнасці справы, журналісты атрымліваюць па семдзесят лістоў штодня з Польшы і Беларусі. Гэта аказвае вялікае ўражанне на кіраўніцтва „хіміяў", у якіх знаходзяцца журналісты: пачало да іх звяртацца „пан", — паведаміў „Выбарчай" Павел Казанэцкі з Усходнееўрапейскага дэмакратычнага цэнтра IDEE, які займаецца дапамогай незалежным медыям на Беларусі.

pahonia.promedia.by

Няроўная роўнасць

Амаль два з паловай месяцы ў Беларусі цягнулася кампанія па зборы подпісаў за выключэнне трох артыкулаў крымінальнага кодэксу. Акцыя пацярпела фіаска.

Асуджэнне журналістаў гродзенскай „Пагоні" нарабіла шмат шуму як у самой краіне, так і за яе межамі. Гэта зразумела — Павел Мажэйка і Мікола Маркевіч былі пакараны па сутнасці за тое, што выконвалі свой прафесійны абавязак — знаёмілі людзей са сваімі думкамі на тыя ці іншыя праявы дзейнасці сённяшняга беларускага прэзідэнта. Слушныя гэтыя думкі ці не маглі б ацаніць тыя, хто давярае гэтаму выданню. Аднак да чытачоў газета не дайшла, бо была канфіскавана, а журналісты трапілі пад суд. У хуткім часе падобны лёс напаткаў галоўнага рэдактара газеты „Рабочы" Віктара Івашкевіча.

Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ), якая з'яўляецца свайго роду дэмакратычнай альтэрнатывай Беларускаму саюзу журналістаў, адразу пасля гучных судовых працэсаў над калегамі пачала кампанію па зборы подпісаў грамадзян. Сэнс акцыі заключаўся ў наступным — з важкай колькасцю аўтографаў звярнуцца ў Палату прадстаўнікоў, каб тая выключыла з Крымінальнага кодэксу Беларусі артыкулы, што, нібыта, абараняюць гонар і годнасць вышэйшых чыноўнікаў. А дакладней — паклёп на прэзідэнта, абраза прэзідэнта і абраза прадстаўніка ўлады. Па кожным з гэтых артыкулаў, калі суд прызнае чалавека вінаватым, яго можна чакаць не адзін год турэмнага зняволення. Трэба адзначыць, што акрамя гэтых не надта прыязных журналістам артыкулаў, у Крымінальным кодэксе таксама закладзена адказнасць за паклёп і за абразу. Але яна, як аказваецца, тычыцца толькі звычайных грамадзян і таму не такая цяжкая. Больш таго, просты беларус мусіць сам вызначыць: пакрыўдзілі яго ці не. Бо ад трэцяй асобы суд нават не прыме зыск, хоць яна і будзе дзейнічаць у інтарэсах шукальніка праўды.

Беларускаму ж чыноўніку, а асабліва прэзідэнту, не трэба клапаціцца самому аб абароне ўласнага „добрага імя". Закон дазваляе гэта рабіць праваахоўным органам у адносінах да каго заўгодна. У выніку, меркаванні следчага пракуратуры, якому, напрыклад, не спадабаўся газетны артыкул з крытыкай кагосьці з уладу трымаючых, могуць з лёгкасцю стаць падставай для ўзбуджэння крымінальнай справы ў адносінах да журналіста, што вырашыў устаць з алоўкам у руцэ супраць, напрыклад, карупцыі ва ўладных калідорах. Ну а суд, што будзе весці суддзя, які згоду на сваё прызначэнне атрымаў ад самога прэзідэнта, а кватэру ад мясцовай „вертыкалі", наўрад ці закрые справу з-за адсутнасці складу злачынства.

Вось і атрымліваецца, што крытыка дзеянняў улады, а таксама яе бяздзеянне пераходзіць у Беларусі ў нешта абстрактнае і небяспечнае. Нягледзячы на тое, што яна амаль асноўная падстава для існавання сродкаў масавай інфармацыі — чацвёртай улады. У такіх варунках лёс сур'ёзных беларускіх газет і электронных медыяў незайздросны. Па вялікім рахунку, яны ператвараюцца ў апявальнікаў усіх дзеянняў чыноўнікаў, перадатчыкаў рэкламнай інфармацыі і забаўляльнікаў ні да чаго не цікаўных гультаёў.

У той жа час грамадству свядома ўводзіцца „аксіёма", што Канстытуцыя краіны носіць па большасці артыкулаў дэкаратыўны характар, асабліва, што тычыцца роўнасці грамадзян перад законам. Бо як аказваецца, сярод роўных ёсць найраўнейшыя.

З такіх меркаванняў і наладзіў БАЖ згаданы збор подпісаў. Працэс прайшоў няблага — за невялікі прамежак часу ўдалося назбіраць 7 000 аўтографаў „роўных" беларусаў. Аднак Палата прадстаўнікоў, што ў большасці складаецца з „найраўнейшых", не палічыла неабходным нешта мяняць у крымінальным заканадаўстве Беларусі. І на гэтай падставе адхіліла прапанаваны законапраект аб скасаванні вышэйазначаных артыкулаў. Адбылося гэта напрыканцы лістапада.

Нягледзячы на паразу, БАЖ абвесціла аб працягу збору подпісаў. Што ж, як гаворыцца, кропля камень точыць. Ды толькі кропель такіх мусіць быць не адна і не дзве.

Уладзімір Лапцэвіч

ТБМ атрымала папярэджанне

29 лістапада 2002 года Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны атрымала пісьмовае папярэджанне ад Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь за подпісам першага намесніка міністра спадара А. С. Петраша. Адказным чыноўнікам міністрэства не спадабалася, што Лідская гарадская арганізацыя ўстанавіла мемарыяльны крыж ля вёскі Беліца Лідскага раёна ў гонар нашых продкаў, якія мужна баранілі сваю айчыну ў XVII ст. Нягледзячы на тое, што папярэдне быў атрыманы дазвол ад мясцовага сельсавета на ўстаноўку крыжа Мінюст прад'явіў нам масу прэтэнзій, у той час як па ўсёй Беларусі мемарыяльныя крыжы і іншыя знакі ставяцца без усялякага дазволу. Нядаўна невядомыя злачынцы ноччу знішчылі вышэйзгаданы крыж і вывезлі яго ў невядомым накірунку. Можна толькі пашкадаваць выканаўцаў гэтага зладзейскага ўчынку, бо мы добра ведаем лёс тых камуністаў, якія ў хрушчоўскія часы ламалі крыжы на беларускіх храмах.

Таксама Міністэрству юстыцыі не спадабалася вераснёўская акцыя ТБМ пад назовам „Размаўляем па-беларуску". Нам выказаны надуманыя прэтэнзіі да афармлення рэкламнага лістка, які ТБМ размясціла ў вагонах мінскага метро. Такім вось чынам была ацэнена дзейнасць ТБМ. Бо, вядома, на тых, хто не працуе, ніхто і не звяртае ніякай увагі.

Алег Трусаў
старшыня ГА „ТБМ імя Ф. Скарыны"

Мелі „Рацыю"

[1 ☞ працяг]

Зіма... Першы дзень снежня. Дакладна паўгода прайшло ад часу банкруцтва „Рацыі". Змянілася толькі тое, што зараз на хвалях 105,5 ФМ не чуваць ужо нічога, а беларускай музыкі напэўна. Нямя ўжо таксама чата, на якім мы сустракаліся, на якім правялі разам шмат часу... Што нам асталося? „Хіба толькі верыць, хіба толькі марыць..."

Будзе вясна, будзе лета... А ці будзе „Рацыя"? Ці з Новым годам зменіцца нешта? Як спявае „Зэт":

З Новым годам!
З Новым шчасцем!

Чакаем таго шчасця.

Зося Лемеш

Не кааліцыя, а пагадненне

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Размова з Міхасём АНДРАСЮКОМ, старшынёю Гайнаўскага аддзялення Беларускага саюза ў РП, сакратаром БНВК у Гайнаўцы.

— Якая будзе карысць ад нядаўна завязанай кааліцыі паміж Беларуска-народным выбарчым камітэтам з Гайнаўкі і кааліцыяй СЛД-УП?

— Гэта не кааліцыя, а пагадненне аб супрацоўніцтве ў самаўрадах Гайнаўкі і Гайнаўскага павета, якое падпісалі Гайнаўская павятовая ўправа СЛД і БНВК. Тычыцца яно ўсіх спраў, але самымі важнымі не павінны быць пасады, а ініцыятывы для дабра людзей. У кожнага камітэта выбаршчыкаў ёсць свае праграмы і самыя важныя справы, якія хоча вырашаць. Аднак для рэалізацыі праграм трэба мець падтрымку большасці радных. Паколькі мы ў гарадской і павятовай радах складаем меншасць, шукаем саюзнікаў для рэалізацыі нашай праграмы. Баюся, аднак, што пагадненне для нас не зусім карыснае, бо ў найважнейшай структуры, управе Гайнаўскага павета, не будзе месца для нашага прадстаўніка. Паспрабуем пераконваць іншых радных у камісіях і на пасяджэннях сесій да нашых прапаноў. Многа будзе залежаць ад умеласцей і дыпламатычных здольнасцей нашых радных.

— А як будзе ў Гайнаўцы?

— У Гайнаўцы і Гайнаўскім павеце за выключэннем БНВК (па 5 радных у радах горада і павета) усе камітэты выбаршчыкаў татальна прайгралі. Можна толькі задумацца, чаму выбаршчыкі тую найважнейшую, самаўрадавую ўладу, аддаюць у рукі палітычным партыям (кааліцыя СЛД-УП — па 10 радных у горадзе і павеце), калі ў іншых гарадах і паветах Польшчы грамадзянскія камітэты выбаршчыкаў карысталіся вялікай падтрымкай. Гайнаўка добраахвотна аддае манаполь на ўладу СЛД-УП. Мы, як БНВК, становімся другой сілай у горадзе і павеце, але толькі па статыстыцы. Фактычна, рашаючы голас у павеце і горадзе мае СЛД.

— Радныя ад СЛД-УП у горадзе не саставяюць большасці ў радзе з 21 дэпутата.

— Так, у самой Гайнаўцы БНВК будзе мець большы ўплыў на пастановы рады. Кааліцыя СЛД-УП не можа самастойна правіць горадам. Аднак, кансалідацыя радных патрэбная толькі некалькі разоў у год, калі праходзяць галасаванні па справах бюджэту, ацэнцы працы ўправы ці бурмістра або калі радныя вырашаюць велічыню падаткаў. Хацелі б мы таксама мець уплыў на важныя для горада інвестыцыйныя планы.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

„Дружба” яднае

Актыўна дзейнічае Клуб сеніёра „Дружба” ў Бельску-Падляшскім. Існуе ён ужо 24 гады. Зараз старшынствуе яму Яўгенія Дзмітрук. Клуб згуртоўвае 56 пастаянных членаў. Сустракаюцца яны кожны аўторак а 17^{00} гадзіне ў пасёлкавым Доме культуры.

Клуб „Дружба” цесна супрацоўнічае з Клубамі сеніёра ў Гайнаўцы — „Рэха пушчы” і ў Сямятычах — „Восень”.

16 лістапада „Дружба” ладзіла святкаванне Дня сеніёра для сваіх членаў і запрошаных гасцей — членаў гайнаўскага клуба „Рэха пушчы”. Сабралася 120 чалавек.

Найперш сеніёры паслухалі канцэрт у выкананні дзяўчат з Бельска-Падляшскага, якія адбываюць рэпетыцыі ў пасёлкавым Доме культуры. Затым адбылася танцавальная вечарына пад музыку аркестра, у саставе якога добра зарэкамендавалі сябе музыкі Міраслаў Валосік і Яўген Шэрэтуха. У перапынках між танцамі прыгожа спявалі беларускія песні Як Вілюк, Ян Лукша і Міхал Карпюк з Гайнаўкі. Увесь час панавала прыемная атмасфера.

На святкаванні Дня сеніёра прысутныя былі, між іншым, бурмістр Бельска-Падляшскага Яўген Беразавец, радная горада Тамара Русачык, намеснік старшыні Жыллёвага кааператыва ў Бельску-Падляшскім Міраслаў Якубюк. У арганізацыі вечарыны дапамагло праўленне Жыллёвага кааператыва і кіраўніцтва кааператыва „Сполэм” у Бельску-Падляшскім.

Янка Целушэцкі

Планы гайнаўскага бурмістра

У час першага пасяджэння новавыбранай Рады горада Гайнаўкі, якое адбылося 19 лістапада, далі прысягу перавыбраны бурмістр Анатоль Ахрыцюк і радныя. Бурмістр у экспазе прадставіў план развіцця Гайнаўкі. Дзеля гэтага прадбачваецца выкарыстаць уваход Польшчы ў Еўрасаюз, суседства горада з Белавежскай пушчай і Гайнаўскага павета з Беларуссю. У планах зроблена стаўка на вышэйшае навучанне і пашырэнне значэння суда, адкрыццё казначэйскай палаты і паболшанне эфектыўнасці працы ў галінах сацыяльнай апекі, асветы, культуры і спорту. Прадугледжана таксама ліквідацыя вугальных кацельняў і дацяпленне жыллёвых будынкаў, што павінна зэканоміць на працягу года некалькі дзесяткаў працэнтаў цеплавой энергіі. У бліжэйшыя гады прадбачваецца завяршэнне пабудовы каналізацыйнай сеткі і асфальтавання ваяводскіх вуліц — Спартовай, Беластоцкай, Пілсудскага, 3 Мая, павятовай — Баторыя і гарадскіх у паасобных жыллёвых кварталах. Бурмістр распрацуе праграму прыцягнення інвестараў і развіцця турызму, паслуг і прамысловасці. Плануецца будова новай звалкі смецця, яго сартавання і утылізацыі.

У час сесіі не прысягаў новаабраны радны ад БНВК Міраслаў Мордань, якога бурмістр вырашыў паўторна назначыць сваім намеснікам. Яго месца ў Радзе зойме іншы радны БНВК, які ў першай гарадской акрузе з ліку кандыдатаў, што не сталі раднымі, набраў найбольш галасоў. Старшынёй рады выбраны быў Якуб Астапчук з СЛД-УП, а яго намеснікамі сталі Мікола Галёнка з БНВК і Ірэна Сегень з СЛД-УП. Радныя запісаліся да камісій. На чарговай сесіі запланавана назначыць камісію для выбару дырэктара Гайнаўскага дома культуры. У канцы кастрычніка папярэдняя ўправа горада, якую ўзначальваў Анатоль Ахрыцюк, вызваліла з пасады дырэктара Міколу Бушко.

Аляксей Мароз

Новаабраныя радныя (злева — з БНВК) і бурмістр Анатоль Ахрыцюк (стаіць)

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Канстанцін Майсеня з жонкай

Узнагарода Канстанціну Майсеню

У беларусаў Гайнаўкі прыемная навіна. 15 лістапада 2002 года наш горад наведалі беларускія дыпламаты з мэтай ушанаваць шматгадовую працу Канстанціна Майсені — заснавальніка і старшыні Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея. Генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Леанід Каравайка і віцэ-консул Ігар Сякрэта прывезлі з сябой Ганаровую грамату Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якой узнагародзілі Канстанціна Майсеню за шматгадовую плённую дзейнасць па захаванні беларускай культуры. Разам з граматай, падпісанай міністрам Л. В. Гулякам, госці ўручылі вялікі букет кветак.

— У гэты момант я паздаравеў і здорава памаладзеў, на 10-15 гадоў, — сказаў узнагароджаны.

Канстанцін Майсеня ў сваім жыцці кіраваўся толькі ўнутранай патрэбай рабіць дабро беларускай справе. Апошнім часам прыхварэў. Зрэдку ўжо наведвае Беларускі музей. Улетку больш часу праводзіў на сваёй дачы сярод духмяных кветак і пад пільнай апекай жонкі Анастасіі, таксама пенсіянеркі, раней настаўніцы беларускай мовы.

— Шчыра дзякую міністру культуры Беларусі спадару Гуляку за памяць аба мне, за тое, што заўважаны былі мае дасягненні на ніве беларускай культуры ў Польшчы, а перад усім на любімай Беласточчыне, — сказаў Канстанцін Майсеня і дадаў са слязамі на вачах: — Мой родны кут, як ты мне мілы...

Карыстаючыся нагодай Канстанцін Майсеня з жонкай Анастасіяй перадаюць шчырую падзяку рэдактару „Беларускага дайджэста” Міколу Прускаму са Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэта дзякуючы яго руплівасці на працягу дваццаці гадоў Грамадскі камітэт атрымаў 40 тысяч долараў на пабудову Беларускага музея ў Гайнаўцы. Вялікую дапамогу музею аказвала таксама Беларусь. Спадар Майсеня мае там шмат сяброў, якім таксама шчыра дзякуе.

Канстанцін Майсеня з вялікай трывогай гаворыць аб будучыні Беларускага музея. Непакоіць яго тое, што да сённяшняга дня не назначаны дырэктар музея, што няма распрацаванай праграмы дзейнасці асяродка беларускай культуры, што невядома калі музей пачне выконваць сваю місію.

Сорамна нам усім перад братамі беларусамі за мяжой!

Віктар Бура

Беларускі камунізм

Пра камуністычны рух на Беласточчыне пісалі раней так часта як цяпер пра антыкамуністычнае падполле пасля другой сусветнай вайны. Дарэчы, часта пра герояў падполля пішуць тыя самыя людзі, якія раней праслаўлялі змагароў рабочага руху і пры тым робяць гэта ў такім самым прапагандысцкім стылі.

З багатай літаратуры пра камуністычны беларускі рух чытач даведаецца няшмат. Раней палітычныя ўмовы і цэнзура вызначалі толькі „правільны" напрамак інтэрпрэтацыі фактаў. Пра камунізм можна было пісаць выключна ў станоўчым тоне. За прапагандысцкай балбатнёю не было відаць ні людзей, ні ідэі. Пасля 1989 г. гэтую тэму спынілі даследаваць яе найбольшыя энтузіясты, якія раней рабілі на ёй навуковыя кар'еры. Найчасцей новымі героямі іх творчасці сталі ахвяры камуністычных рэжымаў. І хаця ўзніклі спрыяльныя ўмовы для сумленнага апісання камуністычнага руху, ніхто гэтым шмат гадоў ужо не займаецца. Прапаганда абмяжоўваецца да простых формаў, дзе тое, што раней было белае, цяпер стала чорным і наадварот.

Літаратура папярэдняй эпохі сцвярджала, што беларускае грамадства ў II Рэчы Паспалітай было вельмі заслужанае для камуністычнага руху. Цяпер, калі адвярнуліся вектары прапаганды, пішуць аб беларусах як аб прыхільніках савецкага імперыялізму. У архіўных дакументах захоўваюцца доўгія спіскі арыштаваных за камуністычную дзейнасць таксама на Беласточчыне. Кожнага года ў кожнай гміне замыкалі тут дзесяткі чалавек, раней прапусціўшы іх цераз следчы апарат, які быў значна больш жорсткі за шматгадовае зняволенне. Паліцыя, не маючы найчасцей адпаведных доказаў антыдзяржаўнай дзейнасці арыштаваных, шляхам псіхічнага і фізічнага тэрору імкнулася прымусіць іх прызнацца ў палітычным злачынстве. У суд вельмі рэдка выклікалі канфідэнтаў у якасці сведкаў. Яны заўсёды патрэбны былі паліцыі для нагляду за больш актыўнымі людзьмі ў сваім асяроддзі.

Спіскі арыштаваных, якіх абвінавачвалі ў дзейнасці ў нелегальным камуністычным руху маглі б сведчыць пра тое, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў структурах КПЗБ і камсамола дзейнічалі пару дзесяткаў тысяч чалавек. Тым часам нават тыя даследчыкі, які імкнуліся даказаць масавасць камуністычнага руху пісалі пра 8 тысяч членаў партыі. Каго тады арыштоўвалі за камуністычную дзейнасць. Прыглянуўшыся дакладней паліцыйным дакументам можна прыйсці да высновы, што падазроным быў кожны больш актыўны вясковы хлопец. Такому адразу давалі „апекуна", які найчасцей быў яму калегам, сябрам, часта сваяком. Даносчыкі інфармавалі паліцыю па розных прычынах — часам з-за грошай, часцей па асабістых матывах, а найчасцей канфідэнт сам быў шантажаваны паліцыяй. Даносчыкамі былі, між іншым, дробныя крыміналісты, якіх паліцыя магла б зачыніць у турме, але за канфідэнцкія паслугі даравала ім свабоду. Чытаючы матэрыялы канфідэнтаў, трэба прызнаць, што некаторыя вельмі сумленна выконвалі свае абавязкі. Інфармавалі яны пра кожнае слова сказанае ягонай ахвярай, якое магло б быць доказам яе камуністычнай арыентацыі ці ўвогуле аблегчыць працу паліцыі.

Варта прыглянуцца тэхналогіі збору доказаў камуністычнай дзейнасці Васіля Трахіміка — жыхара вёскі Дабраволя, што ў Свіслацкай гміне, якога паліцыянты ў следчым арышце прывялі да такога стану, што паспелі толькі давезці ў шпіталь у Ваўкавыску, дзе ён неўзабаве памёр. Калі Трахіміку ў кастрычніку 1936 г. вызначылі канфідэнта, яму было 22 гады. Быў ён вясковым музыкантам і іграў на гармоніку на вясковых забавах. Належаў да вясковай эліты і таму ў натуральны спосаб стаў паліцыі падазроным элементам. „Апекуном" яму назначылі вясковага калегу Мойжэша Лысака. Гэты канфідэнт 7 кастрычніка напісаў першую заяўку, у якой інфармаваў, што Трахімік ездзіў у вёскі Каломна, Грынкі, Нязбодзічы і запрашаў моладзь на забаву ў Дабраволю. Размаўляў з людзьмі, якія падазраюцца ў прыналежнасці да КПЗБ. На забаву ў нядзелю прыехала каля ста чалавек. Адзін з удзельнікаў забавы заклікаў моладзь не піць гарэлкі і часцей хадзіць у царкву. Трахімік у тым часе правёў збор грошай, якія, паводле Лысака, мелі быць перададзены на партыйную дзейнасць, але гарманіст забраў іх сабе. Праўдападобна зарабляў ён такім чынам на жыццё, але канфідэнт інфармаваў, што збіраў на партыйную дзейнасць, пры тым праўдападобна пабольшыў суму сабраных грошай, таму што арганізатары найчасцей плацілі музыкантам не больш чым 5 злотаў.

7 студзеня 1937 г. канфідэнт інфармаваў, што Трахімік заклікаў жыхароў Дабраволі да масавага ўдзельніцтва ў паховінах мясцовага камуніста Язэпа Баско. Лысак заяўляў таксама, што паховіны адбыліся без удзелу святара. Два тыдні пасля інфармаваў, што Трахімік іранізаваў з дзяўчат, якія рабілі вянкі ў царкву, а святара за яго паланізатарскія імкненні назваў слугам фашыстаў. 31 студзеня Лысак расказаў паліцыі, што Трахімік быў у вёсцы Каломна і кантактаваўся там з прыхільнай камуністам моладдзю. 30 красавіка прабываў ён у вёсцы Грынкі, дзе падчас сустрэчы з мясцовай моладдзю крытыкаваліся святары за службу ўладам. Хаця цяжка ў інфармацыях ад канфідэнта Лысака дашукацца доказаў камуністычнай дзейнасці Трахіміка, але выглядала на тое, што адкрыта не пагаджаўся ён з паланізатарскай дзейнасцю мясцовых святароў, якія раскручвалі г.зв. рух праваслаўных палякаў. Арыштавалі Трахіміка 20 ліпеня 1937 г., зараз пасля таго як Лысак паінфармаваў, што набыў ён у Беластоку радыёпрыёмнік і з калегамі слухае перадач з Масквы. Зачынілі яго ў турме ў Ваўкавыску як камуніста, хаця ў яго біяграфіі не было нічога, што магло б сведчыць пра антыдзяржаўную ці камуністычную дзейнасць. У яго дакументах напісалі, што памёр у шпіталі ў Ваўкавыску 5 студзеня 1939 г. Пляваў крывёю, таму лекар напісаў, што захварэў туберкулёзам.

Такіх камуністаў як Трахімік праўдападобна было больш. Уладам аднак вельмі выгадна было змагацца з беларускім рухам, прыпісваючы яму камуністычную арыентацыю. Пад лозунгам змагання з камунізмам ліквідаваліся ўсе арганізацыі і знішчаліся людзі, што перашкаджалі рэалізаваць асіміляцыйную палітыку.

Яўген Мірановіч

Апазіцыя на прыцэле

Апошнім часам у польскім грамадстве, сярод польскіх палітыкаў і на старонках прэсы, у тым ліку і „Рэчы Паспалітай", ствараецца вобраз беларускай дэмакратычнай апазіцыі, які, на мой погляд, не адпавядае рэчаіснасці. Гэта праўда, што сёння з вядомых прычын яна аслабела. Але ў той жа час апазіцыя аб'ядналася вакол агульных стратэгічных мэт, галоўная з якіх — адхіліць дыктатара ад улады канстытуцыйным шляхам. Гэта асабліва адчуваецца ў рэгіёнах. Беларускай апазіцыі ўласціва разважлівасць: пастаўленая ва ўмовы, калі супрацьстаяць рэжыму адкрыта і легальна стала немагчыма, яна не ўжывае сілу, хаця часта да гэтага правакуюць.

Можна толькі здагадвацца, паводле якой палітычнай замовы некаторыя дзеячы польскага руху з Беларусі распаўсюджваюць у Польшчы ілжывыя звесткі пра беларускую апазіцыю, называючы яе нацыяналістычнай і антыпольскай.

Дзеянні апазіцыянераў не могуць быць эфектыўнымі ва ўмовах, калі беларускае заканадаўства адмыслова перарабілі такім чынам, каб літарай закона знішчаць тых, хто не ўхваляе афіцыйную палітыку, а іх прыхільнікаў называць ворагамі беларускага народа, як гэта зрабілі з дэпутатамі Расійскай Думы Ірынай Хакамадай і Барысам Нямцовым. Ім не дазволілі сустрэцца з пазапарламенцкай апазіцыяй, і, прызнаўшы іх прысутнасць непажаданай, наступным рэйсам дэпартавалі ў Расію. Прычына — крытычныя выказванні Хакамады і Нямцова наконт дзеянняў Лукашэнкі ў расійскіх СМІ.

Сёння апазіцыя вельмі аслаблена з той прычыны, што апошнім часам яна аказалася моцна „zdziesiątkowana".

Першы ў спісе

Асабліва перашкаджаў рэжыму харызматычны дзеяч Зянон Пазьняк, лідэр Беларускага народнага фронту. На акцыі, арганізаваныя БНФ, кожны раз прыходзіла некалькі дзесяткаў тысяч людзей, незадаволеных палітыкай афіцыйных уладаў. Пасля распаду СССР парламенцкая фракцыя БНФ на чале з Пазьняком прымусіла камуністычную большасць прыняць Дэкларацыю аб суверэнітэце і незалежнасці Беларусі. Лідэр БНФ выказваўся супраць увядзення ў Беларусі пасады прэзідэнта, бо лічыў, што краіна павінна была стаць парламенцкай рэспублікай.

У 1996 годзе Пазьняк быў вымушаны эміграваць з Беларусі і папрасіць палітычнага прытулку ў ЗША. Як у Беларусі, гэтак і ў Польшчы час ад часу выказваюцца меркаванні, што, нягледзячы на абставіны, ён павінен быў застацца, каб дзеля ідэі трапіць за краты. Ведаючы Зянона Пазьняка і сітуацыю ў дзяржаве, дзе мы жывем, я лічу, што гэткі ўчынак быў бы занадта вялікай ахвярай для Беларусі, тым больш што менавіта на гэта разлічваў яго асноўны палітычны апанент. Гістарычныя падзеі, якія пасля адбыліся ў Беларусі, паказалі, што гэты ад'езд меў сэнс.

Ці выказваўся ён супраць палякаў? — Не. Ці будзе? — Залежыць выключна ад саміх палякаў. Той, хто лічыць, што цяпер Пазьняка-палітыка ўжо не існуе, памыляецца. Некаторыя заходзяць яшчэ далей, называючы яго палітычным трупам. Я ўпэўнены — свайго апошняга слова ў палітыцы ён яшчэ не сказаў.

Калі б на пачатку 90-х гадоў Саюз палякаў Беларусі, які я тады ўзначальваў, не здолеў знайсці агульную мову з Фронтам на чале з Пазьняком, сёння ў Беларусі не было б польскіх школ. Улады вырашылі задушыць польскае адраджэнне рукамі Фронту, але Пазьняк з гэтым не пагадзіўся.

Ён любіў Польшчу

Генадзь Карпенка, віцэ-старшыня беларускага парламента, паслядоўна змагаўся з рэжымам Лукашэнкі. Паводле сацыялагічных апытанняў, пачынаючы з 1996 году, па рэйтынгу папулярнасці сярод насельніцтва ён займаў другое месца — пасля Лукашэнкі.

Смерць Карпенкі стала загадкай для ўсіх супраціўнікаў рэжыму. Ён раптоўна памёр у шпіталі — праз два дні пасля крывазліцця ў мозг, якое адбылося на адным з чарговых пасяджэнняў. За некалькі дзён да смерці Карпенка спаткаўся з Тамарай Віннікавай, экс-старшынёй Беларускага нацбанка, якая знаходзілася тады пад хатнім арыштам. Яна распавяла аб дзейнасці Лукашэнкі і яго найбліжэйшага акружэння, у тым ліку і пра гандаль зброяй. Гэтыя факты далі падставу для абвінавачванняў рэжыму ў бруднай барацьбе з апазіцыяй.

Працуючы ў парламенце 12-га і 13-га склікання — у апошнім ён быў сябрам прэзідыума і віцэ-старшынём парламента — спадар Карпенка з вялікім разуменнем ставіўся да праблем польскай нацыянальнай меншасці. Падчас візітаў у Гродна ён наведваў нашу сядзібу, цікавіўся, чым можа нам дапамагчы. Калі мы пікетавалі парламент Беларусі, каб атрымаць дазвол на пабудову польскай школы ў Гродне, Карпенка быў адным з парламентарыяў, які выйшаў да нас і вёў перамовы. Ён не ўтойваў сваёй пазіцыі, падтрымліваючы нашы патрабаванні, і рабіў усё, каб іх задаволіць.

Ён любіў Польшчу. Ён быў добра знаёмы з многімі польскімі палітыкамі. З вялікай павагай ставіліся да яго і самі палякі. Карпенку цанілі не толькі ўплывовыя апазіцыянеры, але і супрацоўнікі дыпламатычных прадстаўніцтваў, у тым ліку і польскага.

Дзеля справядлівасці ён часта рабіў учынкі, невыйгрышныя для іміджу палітыка, які збіраецца ўдзельнічаць у выбарах на пост прэзідэнта. Так, у інтэрв'ю адной з самых уплывовых беларускіх газет праваслаўны Карпенка выказваўся ў падтрымку Каталіцкага касцёла і крытыкаваў улады за беспадстаўнае прадстаўленне ільготаў для Праваслаўнай царквы.

Апошні раз я размаўляў з Карпенкам па тэлефоне 30 сакавіка 1999 года, адразу пасля яго спаткання з Віннікавай. Ён паведаміў, што напрыканцы чэрвеня ў Варшаве рыхтавалася Еўрапейская канферэнцыя, на якую збіраліся прыехаць прэзідэнты, прэм'ер-міністры і міністры замежных спраў з усёй Еўропы. Замест Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Беларусі на канферэнцыю запрасілі Карпенку, і ён прапанаваў мне суправаджаць яго ў якасці памочніка. Я сказаў, што патрабую часу, каб падумаць. Неўзабаве я даведаўся, што Карпенка ў шпіталі. А праз некалькі дзён беларускі народ страціў аднога са сваіх лепшых сыноў. Праз некаторы час яго сям'я была вымушана пакінуць Беларусь і папрасіць палітычнага прытулку ў Германіі.

(працяг будзе)

Тадэвуш Гавін

„Паласатая” літаратура

[1 ☞ працяг]

Адметным з’яўляецца і цікавае апавяданне Наталлі Кандрацюк-Свярубскай „Як рыцар Точак выратаваў Брыгіду”. Варта адзначыць свежасць тэмы, захапляльна-прыгодніцкі сюжэт, уменне аўтаркі лаканічна перадаць сутнасць і акрэсліць вобразы. Гутарка ідзе пра падзеі XII стагоддзя, але вельмі ўдала ў апавяданні выкарыстаны сучасны каларыт: „Ехаў праз Чорны Лес, пра які напісалі аднойчы ў коміксе. Для ўсёй вёскі гэта была важная падзея, таму што ўся яна чытала гэты комікс”. Комікс у XII ст. — вобразная нечаканасць: змяшчэнне часу, як мастацкі прыём, можа быць апраўданым у дадзеным кантэксце. Але хацелася б больш такіх нечаканасцей і больш вострых сюжэтных паваротаў. Тады апавяданне набыло б канкрэтнае мастацкае афармленне... а так застаецца на ўзроўні замалёўкі на гістарычную тэматыку.

У падборцы твораў Магдаліны Леанчук вельмі шмат пытанняў і мала адказаў — гэта характэрная для такога ўзросту з’ява. Але Магдаліна не проста шукае адказы — яна імкнецца засяродзіцца на пачуццях, эмоцыях (падчас вельмі суб’ектыўных), нейкай вызначальнай з’яве, каб паставіць чытача перад двухсэнсоўным пытаннем: „Чым жа мае намі скалануць прырода? Красой ці брыдотай?” — пытанне, якое вартае сапраўднай літаратуры (згадаем вядомае: „прыгажосць уратуе сусвет”). У цэлым, вершы Магдаліны палягаюць у бясколеравым мадэрновым павеве, у якім вельмі цяжка быць арыгінальнай. Застаецца толькі добрая прэтэнзія, што, таксама, нямала і, што дае пэўныя спадзяванні ў вызначэнні творчай індывідуальнасці і творчай дасканаласці.

Сярод твораў, якія пададзеныя на конкурс, ёсць некалькі цікавых літаратурных абразкоў, якія ўяўляюць амаль што ідэальны варыянт цэласнасці (ідэя, пафас, змест, форма) і завершанасці мастацкага твора. Да ліку такіх можна аднесці кароценькае апавяданне — лірычны абразок Наталлі Зофіі Лемеш „Кветка” і жартоўны абразок Пятра Акуліка „Пакуты сабакі Шарыка альбо Як дзядзька Ясь стаў філосафам”. Так, у „Кветцы” строга вытрыманы рамантычны, з адценнем сентыментальнасці, стыль; твор напоўнены пачуццём шчырай пяшчоты і замілавання, узнёсласцю пачуццяў і мараў і, разам з тым, нейкім суперажываннем духоўнай неўладкаванасці, болем страчанага шчасця і вечнага спадзявання. Удала спалучаецца вобраз „Кветачкі” ў кантэксце дыялогу з Ім. Дыялогу глыбокаму паводле сутнасці і існасці, і лёсавызначальнаму паводле сэнсу. Можна засумнявацца ў намеры героя „перамагчы Час і Прастору”, але толькі не ў яго пачуццях, такіх жа крыштальна-чыстых і светлых як яго думкі і словы. Так можа зрабіць той, хто хоча быць богам для яе. І нічога няма ў апавяданні штучнага, надуманага, дэманстратыўнага.

Абразок Пятра Акуліка (дарэчы, аўтар найбольш парадаваў сваімі творамі) „Пакуты сабакі Шарыка...” напісаны ў стылі народнага жарту; вызначаецца характэрным народным гумарам, трапнасцю народных выказванняў, дасціпнасцю і ўменнем аўтара акрэсліць сітуацыю ў адпаведнасці характараў. На адной старонцы змешчаны не толькі „пакуты сабакі Шарыка”, але амаль што цэлая сцэна (таксама набліжаная да пакутаў) з жыцця дзядзькі Яся. Перад чытачом паўстае жывы чалавек са сваімі клопатамі, турботамі, патрэбамі і — сваім поглядам на жыццё. Камізм сітуацыі цудоўна завершаны філасафічнай канцоўкай: „Вялікая смага — мацней, чым каханне, — зрабіў выснову дзядзька Ясь”. Падборка твораў П. Акуліка вызначаецца няроўнасцю. Ёсць абразкі і вершы, якія патрабуюць грунтоўнай рэдакцыйнай праўкі (заўвага можа быць адрасавана кожнаму ўдзельніку), але, што не адняць у Акуліка, — гэта назіральнасць, якая так неабходная пісьменніку, і жывая вобразнасць, што пераканаўча перадае выявы прадмету гутаркі.

У многіх творах канкурсантаў ёсць цікавыя думкі, ідэі, вобразы, але яны не даведзены да паэтычнасці, да мастацкага завяршэння; бракуе аўтарам элементарнага ведання асноў вершаскладання, глыбіні думкі, вобразнасці, свежасці тэм, разнастайнасці. Цяжка прасачыць, асабліва ў празаічных творах, лагічную падпарадкаванасць кампазіцыі і сродкаў выяўлення цэласнай ідэі. Наогул, у некаторых творах цяжка прасачыць і саму ідэю і сэнс твора. Аўтар павінен ведаць, што ён хоча сказаць чытачу (калі яму ёсць што сказаць) і знайсці найкарацейшы шлях у гэтым кірунку, без лішніх, пустых і непатрэбных слоў і вобразаў, якія ствараюць метафарычную несуразніцу, зацямняюць, загружаюць, размываюць задуму аўтара, сэнс, структурнае адзінства і мастацкую каштоўнасць твора. Аўтар павінен задумацца над тым, якім чынам лепш выкарыстаць лексіка-граматычны склад мовы, падпарадкаваць вобразную структуру для выяўлення сваёй ідэі, сэнсу, пачуцця, густу і г.д. Перайманне мадэрновых формаў літаратуры і жаданне быць модным, на нашу думку, толькі шкодзіць, асабліва маладым аўтарам, тым, якія, магчыма, не азнаёмлены з класічнымі формамі верша. А варта было б згадаць і харэй, і ямб, і трохстопныя склады, і, што такое рытм, і, што токое рыфма... і паспрабаваць свае сілы ў гэтым кірунку, а пасля ўжо займацца эксперыментамі. У большасці аўтараў адсутнічае творчая індывідуальнасць, а таму і адсутнічае, што аўтары альбо мала працуюць, альбо зусім не працуюць над сваім інтэлектам, не звяртаюцца да крытычнай літаратуры, не чытаюць мастацкія творы, не чытаюць творы беларускамоўныя, што прыводзіць да духоўнай мізэрнасці і адсутнасці духоўнага досведу — усё, што не можа ўплываць на стварэнне высокамастацкага тэксту. Вельмі шмат моўна-стылёвых памылак, адчуваецца моцны ўплыў польскай мовы: ужыванне паланізмаў, выкарыстанне польскамоўных канструкцый сказаў, словазлучэнняў, словаўтварэнняў і г.д.

І, усё ж такі, літаратура канкурсантаў пакуль што застаецца „паласатай” (гэта нармальны працэс). Гэта і добра, і кепска. Добра, што ёсць светлыя „палосы”, кепска — вельмі шмат „палос” не светлых. Ад іх — удзельнікаў літаратурнага конкурсу — саміх жа і залежыць, наколькі беларуская літаратура на Беласточчыне ў будучым пасвятлее, альбо пацямнее.

Янка Трацяк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Літаратурная сям’я. Унізе злева: Радаслаў Маціевіч і Зінаіда Лукша-Кавалевіч (аўтарка апавядання „Панада”). Стаяць злева: Міра Лукша, Мартына Ева Леанеўская, Аліна Гапуновіч і Канрад Леанеўскі.

Іда Кавалевіч

Панада

Мальвіна кінулася следам за Антонам, уся ў слязах. З вяселля Мірыкавага выбеглі абое. Антон кульнуў больш чарак, чым абяцаў. А піць яму нельга. Прысягаў жа ж! Што яму — піць буду, курыць буду! А кабеце — цярпець усё, пакутаваць? Дзяцей трое, грошай няма. Не, грошы Антон зарабляе, але мае дзе іх выдаваць. Майстар у гэтай справе, горш з умелымі рукамі. Але працу далі яму, калі прыехаў з Грудзёндза. Хлопец прыгожы, статны. Не адна паненка за ім углядалася, а выбраў Мальвінку. І Мальвінка харошая, але бацькі ёй нічога не далі. Пра тое, што далі ці не далі Мальвінчыны продкі, гаварыла адно маці Антона. Бо любоў не адно тое, што хапае, каб жыць добра. Але хату паставілі. Машыну старую купілі. Мальвіна раней працавала ў разлеўні напояў, някепска зарабляла. Але пасыпаліся дзеці, і на працу ўзялі суседку. Дык разлічвай, баба, на грошы, якія мужык у хату прынясе...

Кінулася Мальвіна за Антонам, ды прыстала. Стамілася. За слязамі дарогі не бачыць. І за сэрца схапілася. Ад жалю, здавалася б, лопала яно ў яе грудзях. Добра, што ехаў насупраць малым „Фіатам” паштар, забраў яе дадому. А ў хаце маці лямантуе: чаго так падаць за чалавекам! З Антона ніякі не бацька, а, не дай Бог, і сама Мальвіна кончыцца. Што вы думаеце, трое дзяцей сіротамі пакінуць? Каму на галаву? Бабе-дзеду, дзяржаве! Каб так людзі думалі, не пілі б, не разводзіліся б! — ламала рукі Мальвініна матка.

Паехаў Антон да свае маці. Там прынамсі не дзяўбуць: кінь курыць. Сама Агата курыць. Бо ж мястовай паняй была. І, кажа, чаго табе тая Мальвіна! Лепш плаціць аліменты, чым нервы сабе псаваць. Усё ж, не сцярпела Мальвіна, паехала ў мястэчка. Кахае ж, сумуе, дзеці плачуць... Жыццё кавалак разам пражылі. Ні маткі слухаць не будзеш, ні цёткі, ні нават самога бацюшкі, калі сэрца прыпячэ.

Яшчэ раз спрабавалі пачаць жыццё разам Мальвіна з Антонам.

На гэты раз Антон з’ехаў у сталіцу. З работай там лягчэй. Праўда, грошы слаў. Ды колькі тых грошай! Праз паўгода не сцяпрела Мальвіна, паехала пабачыцца. Хоць пару дзён пабыць з мужам. А дзе ж такога ўпільнуеш! Ён і тут за кабетамі азіраўся, а, выпіўшы, то і за абы-якую браўся. А ў той Варшаве — панад колькі! Калі б Мальвіна думала пра ўсё гэта — адурэла б. А хоць так, за работай і дзецьмі, бы лягчэй крыху, хоць ой як цяжка!.. Пабачыла, пабыла, адпусціла на сэрцы, а толькі села ў цягнік у Гайнаўку, зноўку ў нутры заныла...

Праз год прыехаў Антон дахаты. Нават у маткі не быў у мястэчку. Дзяцей па галоўках пагладзіў, з Мальвінай на вялікай хаце зачыніўся. Пра ўсё расказаў. Пра вірус той, якога набраўся. Ад чаго? Мо калоўся, мо з мужыкамі спаў? От, звычайна, здрадзіў раз з адной бабай. А тая — хворая. А калі гэта было? Перад тым, як Мальвіна да яго прыязджала!..

З гэтым, казалі лекары, жыць можна не так яшчэ і мала. Толькі крыві асцерагацца, і спаць трэба як асцярожна. І дбаць пра здароўе. Вось, не прастываць, гарэлкі не піць. Бо імунітэт паніжаны. Слухала, слухала Мальвіна тое, што тлумачыў ёй муж, і ахала. У сэрцы халадзела. А што, калі... і яна?.. Паехалі разам у заразны шпіталь у Беласток, праверыцца.

Антон зрабіў гэта хутка. Выпіў літр гарэлкі, сеў у цесцеў „Тарпан” і разбіўся пад мястэчкам. Мальвіна жыве, гадуе дзяцей. Асцерагаецца. На лякарствы шмат не выдае — хворым СНІДам яны оптам паніжаны. І мае надзею, што ў сусветных лабараторыях знойдуць нейкі цуда-лек на чуму апошняга стагоддзя...

Пятро Акулік

Беларусь

Беларусь мая, матуля сінявокая,
У час, калі далёка ад цябе,
Вабіш беларускаю гаворкаю,
Дабрынёй людзей ты вабіш да сябе.
Прыгажосцю лесу ды птушыным гоманам,
Срэбрам хваль, што Нёман ў далячынь нясе,
Вузкаю сцяжынкаю ў жыце схаванай,
Ды вачамі валошак у ранішняй расе,
Ліпавым духмяным пахам лета,
Над ракой імклівай схіленай вярбой.
Сінявой нябёс дзе жаўрука санеты,
Льюцца над Прынёманскай зямлёй.
Хай ляцяць па-над табою вёсны,
Льецца дзён тваіх імклівая рака,
Мірнага жыцця няхай працуюць кросны
Ды гучыць над краем песня жаўрука.

Мацярынскі позірк

Пяшчотныя, з слязою радасці ды болю
На гэты свет упершыню цябе сустрэўшыя аднойчы,
Чые вочы?
— Матуліныя вочы.
Рашучая на ўсе, трывогі поўныя у час тваіх хваробаў,
Не закрываўшыя павек у такія ночы.
Чые вочы?
— Матуліныя вочы.

Дні, месяцы, гады чакаўшыя цябе. Сустрэўшыя і
Прыгажэй усіх вачэй дзявочых.
Чые вочы?
— Матуліныя вочы.

І колькі завіруха лёсу ў жыцці не круціць,
Няхай яна той позірк не азмрочыць,
Што дараць нам матуліныя вочы.

Зорка

старонка для дзяцей

Альжбета Юшчук іграла Шапэна

Комплекс музычных школ у Беластоку шумна адсвяткаваў трыццацігоддзе свайго існавання. 20 лістапада г.г. у актавай зале Медыцынскай акадэміі канцэрт сыгралі вучні школы.

Канцэрт пачала Альжбета Юшчук. Эля сыграла паланез Шапэна. Класна і бліскуча! Сябры падарылі ёй кветкі, а публіка — бурныя апладысменты.

Эля вучаніца шостага класа ПШ н-р 4 у Беластоку. Яна выдатніца па ўсіх прадметах. З прадшколля вывучае беларускую мову, у 2001 годзе заваявала першае месца ў конкурсе „Роднае слова".

На раялі Альжбета іграе з маленства. Зараз яна вучаніца прафесар Гражыны Арысяк.

— Майстрам і натхняльнікам для нас — Ян Тарасевіч, — адзначае бацька Элі, мецэнас Пятро Юшчук.

Невыпадкова. Першай настаўніцай музыкі маладой піяністкі — вучаніца Яна Тарасевіча, спадарыня Аліцыя Багінская. Ян Тарасевіч — піяніст, кампазітар і педагог, быў настаўнікам Ніжэйшай і сярэдняй музычнай школы Галены Франкевіч. Працаваў тут у 1947-1956 гадах. На аснове гэтай установы стварыўся Камплекс музычных школ — музычнае прадшколле, пачатковая школа, гімназія, ліцэй. Таксама ў Беластоку знаходзіцца філял Варшаўскай музычнай акадэміі імя Фрыдэрыка Шапэна.

Канцэрт, у якім выступіла Эля Юшчук, праходзіў пад лозунгам: „Школа майму гораду".

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Іграе Альжбета Юшчук

Вершы Віктара Шведа

Пазнаёміліся

Год школьны распачаўся
І пачалася праца.
Настаўнік новы ў класе
Пачаў тут прадстаўляцца.

— Я — Мечыслаў Карэтка.
Хачу, каб памяталі.
А вы, скажыце, дзеткі?
— А мы не — адказалі.

Ты ж, сынок, дырэктар

— Школа, мама дарагая,
Гэта мая роспач, згуба.
Мяне дзеці абзываюць,
І настаўнікі не любяць.

— Не рабі, сынок, крамолы,
Ці ж сядзець ты будзеш дома?
Адкажы мне, што за школа
Без дырэктара, вядома.

Ноч

Ноч поўная зорак і цемры
Неба засланяе чорнымі хмарамі
Поўнымі грозы і нянавісці
Цені дрэў ходзяць па вуліцах
Месяц адбіваецца ў вокнах
Людзі ў чорных капелюшах
Лісты свабодна ападаюць з дрэў
Страх нараджаецца ноччу
Такая ёсць менавіта НОЧ

Юліта ЯКУБОЎСКАЯ,
III „б" клас Гімназіі ў Орлі

Польска-беларуская крыжаванка № 49

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжанку н-р 45: Сом, абнімкі, краса, Лі, рад, пазваночнік, квадрат, клад. Брат, акрабат, абраз, надвор'е, ціс, магніт, сілач, нага, блакіт.

Узнагароды, аўтаручкі-„памятнікі", выйгралі: **Марцін Александрук** і **Паўліна Мароз** з Новага Корніна, **Раман Лушчынскі**, **Аня Хількевіч** і **Агнешка Семянюк** з Бельска-Падляшскага, **Марк Саевіч** і **Бэата Аксютыч** з Арэшкаыва, **Паўля Віталеў** з Орлі, **Эва Сегень** з Беластока. Віншуем!

Дзённік Міколы

Падарожжа у Краіну Гот

Калі я ішоў па лесвіцы да Нор Узі, пачуў нейкія галасы ў падвале. Я спалохаўся, падумаў: вярнуліся Ліняцкія! На шчасце гэта быў толькі бацька ўпартай Дамінікі. Ён размаўляў з незнаёмым.

У доме Нор Узі мяне зноў папракнулі сябры. Я спазніўся на адну хвіліну.

— Зноў давялося цябе чакаць! — абурыўся Томак. — Мы ледзь цябе дачакаліся. Праз момант рушым у дарогу.

— Куды? — я здзівіўся, бо ж... прыйшоў на ўрок малявання.

— Ты зноў ні пра што не ведаеш, — абурыўся Ярак. — Аня табе не сказала?

— Не было такой патрэбы, — азвалася Аня, — ён з намі не паедзе, бо ён... замнога хлусціць!

— А ты такая святая? — заступіўся за мной Тамаш. — І табе трапляюцца разыходжанні з праўдай.

— Усе паедуць! — сказаў Нор Узі. — Усе!

— Але мае бацькі ні пра што не ведаюць, — сказаў я спакойна.

— Не хвалюйся, Мікола, — падняў угару ўказальны палец Нор Узі, — я ўжо іх папярэдзіў.

— Гэта клас-с! — я аж падскочыў ад радасці. — Але куды мы збіраемся?

— У Краіну Гот, — прашаптала Аня.

— Далёка яна?

— Далёка! — Нор Узі ўсміхнуўся. — Аднак вы не хвалюйцеся, бо у Краіну Гот можна трапіць толькі раз, адзін раз у жыцці.

— Лепш раз — як ніколі! — засмяяўся Ярак.

— Як гэта... — здзівілася Аня — Вы, здаецца, былі там ужо сто разоў?

— Я — так, — сказаў таемна мастак, — ну, але вы, дзеці... і толькі што знаёміцеся з сакрэтамі мастацтва. Цяпер сядайце ў машыну. Пара ехаць. Андралекс чакае...

Папраўдзе, я і мае сябры нічога не ведалі пра Нор Узі, ды і не пыталі пра ўсё мастака. Калі мы селі ў машыну, я прыкмеціў у руках Ані „хлус-кант".

— Напэўна, будзе бяда! — падумаў я.

Я люблю марыць і летуценіць, час ад часу мне здараецца прыдумаць нейкую няпраўду, звычайна, каб развесяліць апошніх.

Вы ж памятаеце, як „хлус-кант" нядаўна акампраметаваў мяне перад бацькамі...

(працяг будзе)

(нак-с)



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пачаўся Піліпаўскі пост і... падрыхтоўка да Каляд (на здымку мастак Тодар Кашкурэвіч і наш паэт Рафал Сельвясюк)

Здымкі

Здымкі я раблю,
Бо гэтае вельмі люблю.
Здымкі я збіраю —
Іх многа маю.
Збірай ты таксама.
Праз некалькі гадоў,
Калі пабачыш іх,
Расцвіцеш як цвет —
Колераў набярэ твой свет.
Пабачыш, які ты калісьці быў,
Як ты вельмі добра жыў.
Здымкі пакажуць табе прошлае.
Пакажы іх дзецям,
Яны — пакажуць тваім унукам.
А ўнукі — праўнукам.

Рафал Сельвясюк,
III „б" клас Гімназіі ў Орлі

Нож

Нож востры. Нельга яго браць у рукі. Ляжыць на стале ды пабліскваe стальным лязом. А ручка ў яго чорная, цёплая. Мацейка дакранаўся да нажа, калі бабуля, седзячы на ўслончыку, здымала ім лупіну з бульбы. На лязе застаўся матавы след ад сырое бульбіны, быццам хто памазаў яго мокрай мукой. У бульбе ёсць такая мука, сказала баба Рэня, крухмал. А нажа лепш не чапаць. Вырасцеш, возьмеш у рукі нож. Нарэзаць хлеб, сыр, нашынкаваць капусту, цыбулю... аблупіць скурку з ябылка.

— Ай, чаму ён кусаецца, пытаешся? — засмяялася бабуля, бо, усё ж, унучак асмеліўся ўзяцца за лязо. — Кусаецца, бо такая ягоная натура. Вырасцеш... Ён і ружжо — і абарона, і атака.

— Мама, — азвалася мама Мацейкі, — не гаварыце зашмат дзіцёнку. І посуд, і набор класці трэба на сушылку. А вы пра такое. Лепш казку збаялі б...

— Казку, кажаш, дачушка, такую, каб не было зла... Ды ў кожнай казцы ёсць ліха і дабро... Ну, не чапай нож, Мацейка! Сапраўды, на стале нічога нельга пакідаць, калі ў хаце малое дзіця.

Трохгадовы гадаванец бабы Рэні і мамы Галі з сумам паглядзеў на сушылку, дзе пасля мыцця высыхалі таляркі, шклянкі, нажы, відэльцы, лыжкі і лыжачкі.

— Буду вялікі, дастануся!

Хлопчык заглянуў у місу, у якой мама вялікай лыжкай-відэльцам падкідала каляровы салат — чырвоны ад перцу, аранжавы ад морквы, зялёны ад агурка, светла-зялёны ад капусткі... Пасля накапала туды маянэзу... Колеры сталі лагоднымі, мяккімі. Запахла ружова, млечна-аранжава... На стале завіравала варанае крэмавае яйка — бабуля правярала, ці зварылася ўкрутую. Затрымалася яно каля пукатага, бліскучага, надзьмутага памідора. Нож бліснуў лязом, укаўзнуўся ў чырвоную мякаць. Мацейка аблізаўся — колеры смакуюць!

Пакуль бабуля з мамай упраўляліся на кухні, хлопчык ціхенька пайшоў у пакой, паклаў на стол ліст паперы і каляровыя алоўкі. Як намаляваць... смак?! Салодкі, кіслы... Чырвоны, жоўты, зялёны?.. І халодна-куслівы дотык нажа?

Ой, зламаўся кончык алоўка. Замоцна ціснуў Мацейка на паперу, каб намаляваць смак чырвонага перцу.

— Нож трэба, перш за ўсё, каб з алоўка дастаць колер! — зразумеў Мацейка і пахваліўся здагадкай, заглянуўшы на кухню. Мама з бабай, здаецца, не пачулі.

— Эх, калі я дастануся да сушылкі... — уздыхнуў Мацейка, пастаяўшы яшчэ хвілінку на парозе.

Міра Лукша

Мама не верыла, што пішу...

Рэдакцыя „Зоркі" гутарыць з Паўлінай Нічыпарук, лаўрэаткай VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы.

— Нядаўна чытачы „Зоркі" мелі магчымасць пазнаёміцца з тваім (і Міхася Дразда) нарысам пра вёску Скупава. Сёння ты выступаеш як паэтка.

— У вершах я магу раскрыць свае думкі. Хачу, каб іх ведалі мае бацькі і сябры.

— Як яны ўспрымаюць твае думкі?

— Калі я прыступіла першы раз да конкурсу, мая мама не верыла...

— ... у тое, што мае такую здольную дачку?

— Што ўмею пісаць вершы!

— Як яны ў цябе пішуцца?

— Маю вялікую падтрымку настаўніцы. Яна нас заахвочвае пісаць, пасля дапамагае, паказвае нам памылкі.

— Раскажы пра сваю настаўніцу і школу.

— Вучуся ў III класе Гімназіі ў Нараўцы. Беларускую мову выкладае ў нас спадарыня Ганна Кандрацюк.

— Якое супадзенне фактаў: ваша настаўніца завецца так, як рэдактар „Зоркі"... Заахвочвае вас прымаць удзел у конкурсах?

— Не толькі намаўляе, яна дапамагае нам зразумець, якая гэта важная справа.

— Паўліна, якіх любіш аўтараў?

— Мне падабаюцца Якуб Колас, Адам Міцкевіч.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паўліна Нічыпарук

— А якія прадметы?

— Вядома, найбольш беларуская мова і рэлігія.

— У вашым нарысе пра вёску Скупава адчуваецца цікавасць да роднай спадчыны, ты таксама ўмееш гаварыць пабеларуску. Скажы, кім хочаш быць у жыцці?

— Настаўніцай беларускай мовы!

— Каторы раз удзельнічаеш у конкурсе?

— Другі раз.

— Што значыць для цябе вылучэнне?

— Не ведаю, аднак, вельмі цешуся. Можа... маімі творамі пацікавяцца сябры?

— Гэтага табе жадаю.

Гутарыла Ганна Кандрацюк

Паўліна Нічыпарук

Месца майго дзяцінства

Там дзе рэчка я шпацыравала заўсёды
Было гэта месца, дзе можна спакойна думаць.
Гэта тут я правяла гады дзяцінства
Шчасця і смуткаў.
Прыходзіла я сюды заўсёды, аж аднойчы
Сустрэла маленькага сабачку.
Цяпер ён мой найлепшы сябра
Усё стала прыгожым і добрым.

Божа каханы

Чаму на свеце столькі
Няшчасця, катастрофаў?
Чаму адзін чалавек не хоча
Падаць рукі другому чалавеку?
Чаму неба зноў пахмурнае
І ідзе густы дождж?
Чаму дзіця сядзіць адно на лавачцы
Са смуткам на твары?
Чаму зноў людзі гінуць у катастрофах?
Ці гэты свет мусіць быць такі
Нядобры для людзей?

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Беларусь і Напалеон

Першыя бітвы

Напалеон разлічваў паасобку разбіць расійскія арміі недалёка ад мяжы і прымусіць Расію падпісаць мір. Але царскія генералы вырашылі не ўступаць у вырашальную бітву, пакуль не аб'яднаюць свае войскі. Французы ж імкнуліся сарваць гэты план. Каля гарадоў Кобрына і Міра, блізу вёсак Гудзевічы на Гарадзеншчыне, Салтанаўка на Магілеўшчыне ды ў іншых мясцінах беларускай зямлі з першых дзён вайны ішлі крывавыя баі.

У ліпені вялікая бітва адбылася каля вёскі Клясціцы, што пад Полацкам. Сам Полацак французы занялі без цяжкасцяў. Адсюль адкрываўся шлях на расійскую сталіцу Санкт-Пецярбург. Дарогу туды абараняў корпус царскага генерала Вітгенштэйна.

У Вітгенштэйна было 18 тысяч салдат і 108 гармат, а ў французскага маршала Удзіно — 25 тысяч конніцы з пяхотай 1 114 гармат. Тры дні на беразе ракі Дрысы кіпела бітва. Расіянам усё ж удалося спыніць наступ напалеонаўскіх палкоў на Пецярбург.

Пад Клясціцамі быў смяротна паранены таленавіты царскі генерал Якаў Кульнёў. Напалеон умеў высока цаніць мужнасць і адвагу праціўніка. Даведаўшыся пра геройскую смерць генерала, французскі імператар паслаў у Парыж адмысловага гонца з лістом, дзе называў Якава Кульнёва адным з найлепшых афіцэраў расійскай кавалерыі.

Сёння імем генерала Кульнёва называецца адна з полацкіх вуліцаў.

Роўна праз месяц пасля Вільні Напалеон уступіў у Віцебск. На падыходах да горада, каля мястэчка Астроўна, расійскія войскі зноў сустрэліся з французамі. Бой быў такі цяжкі, што на дзесяці вёрстах ад Астроўна да Лучосы забіты ці паранены ляжаў на кожным метры дарогі.

(працяг будзе)

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Чытае верш Надзея Дудзік

З глыбі (гарадоцкага) сэрца

*Жыццём напісана** — гэта загаловак першага зборніка вершаў і прозы, выдадзенага ў пасляваеннай Польшчы ў Гарадку. Яго аўтары — члены літаратурнай групы „Каласы", якая дзейнічае пры гарадоцкім Гмінным асяродку культуры.

Урачыстая прэзентацыя гэтай кнігі, якая налічвае больш за 150 старонак, адбылася ў перапоўненым публікай ГОКу дзень да польскага Свята незалежнасці.

— Ці гэта каму падабаецца, ці не, пакінем па сабе трывалы след, — сказаў адзін з ініцыятараў і аўтараў зборніка, паэт, лаўрэат шматлікіх літаратурных конкурсаў Канстанцін Казлоўскі.

Ідэя прэзентацыі гарадоцкіх майстроў слова шырэйшаму колу жыхароў гміны ўзнікла ў снежні 2000 г. у час сустрэчы рэдакцыйнага калектыву „Гарадоцкіх навін — Gazety Gródeckiej" з чытачамі. Прысутныя сябры, згуртаваныя ў літаратурнай групе „Каласы" мелі публікаваць свае творы на яе старонках. Аднак, з-за розных прычын, толькі тройцы беларускамоўных творцаў удалося прабіцца на старонкі мясцовага часопіса — Надзеі Дудзік, Ніне Цыванюк і Яну Федзюкевічу.

— Аказалася, шмат людзей у Гарадку не ўмее чытаць па-беларуску, — успомніў Канстанцін Казлоўскі. — Гэта пасля мела ўплыў на рашэнне падкласці польскія літары пад беларускія словы. Мы не хацелі, каб наша кніга была „półkownikiem"; нам хацелася дайсці да шырэйшага кола чытачоў.

Канчаткова агромны ўплыў на публікацыю кнігі меў, інспіруючы яе друк, тагачасны войт Гарадоцкай гміны Яўген Семянюк. Працы над зборнікам дванаццаткі яго аўтараў і сяброў групы „Каласы" працягваліся ад красавіка. Выданне паказалася ў ліпені. Прэзентацыю, па прычыне вакацыйнага, а пасля выбарчага перыядаў, адклалі да 10 лістапада.

Сярод большасці паэтаў групы „Каласы", аўтараў „Жыццём напісана", ёсць аўтары трох пакаленняў: ад найстарэйшай, дзевяностагадовай Надзеі Дудзік да дваццацігадовых Анны Сілкін ці Монікі Асінскай ды трыццацігадовага Рамана Іванюка.

— Мы не марым аб літаратурных лаўрах. Хочам, каб нас разумелі простыя людзі гарадоцкай вуліцы, — запэўніваў Канстанцін Казлоўскі. — Гэта выданне ні польскае, ні беларускае, а проста наша — гарадоцкае.

Самыя цёплыя і найбольш хвалюючыя творы гэта вершы найстарэйшых аўтараў, часта лірычна і настальгічна апісваючыя мясцовую прыроду, родную старонку, навязваючыя да гарадоцкіх звычаяў ды традыцый, якія падкрэсліваюць прывязанасць да зямлі і мясцовы патрыятызм з элементамі тугі па мінулым. А шмат тэкстаў аўтараў малодшага пакалення прысвечаны любові і каханню. У зборніку знайшлі месца і сатырычныя вершыкі Янкі Грыцука ды „Ужываючы колеры" Адама Сямончыка (разам з рэпрадукцыямі ягоных карцін).

— Я пішу ад душы і сэрца. На што пагляджу, аб тым і пішу, — так аб сваёй творчасці сказала папулярная сярод гарадчан Ніна Цыванюк.

Што цікава, маладыя жыхары Гарадоцкае гміны пішуць і публікуюць, а ў час вечара ў ГОК чыталі свае вершы па-польску, старэйшыя — па-беларуску (па-гарадоцку).

У час прэзентацыі „Жыццём напісанага", несумненна, верхаводзіла паэтэса і пяснярка Марыя Врублеўская, якая выспеўвала м.інш. творы сваіх калег па пяры, у тым беларускамоўнага Міколы Гегеля, галоўным матывам якога — „мая родная старонка". Акампаніяваў ёй беларускамоўны празаік Янка Карповіч. Члены групы „Каласы" падаравалі па пяць экземпляраў сваёй кнігі бібліятэкам гарадоцкае школы і асяродка культуры.

„Жыццём напісана" пераплятаецца здымкамі і біяграмамі аўтараў ды малюнкамі Марыі Мялешкі. Не ўдалося, аднак, абысціся без эдытарскіх (друкарскіх і карэктарскіх) памылак. Нягледзячы на гэта, важнейшы сам факт, што кніжка паказалася і ёсць не толькі прэзентацыяй гарадоцкіх літаратараў, а і творчым запісам гарадоцкай рэчаіснасці і стану духа гарадчан.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

*„Życiem pisane". Zbiór wierszy i prozy Grupy Literackiej „Kłosy", działajacej przy GOK w Gródku; wydawca: Wojewódzki Ośrodek Animacji Kultury; wydano przy wsparciu finansowym Urzędu Gminy w Gródku; redakcja: Radosław Ciepłucha; grafika: Maria Mieleszko; projekt okładki: Jacek Chańko.

Выстаўка з юбілеем

У галерэі „Гайна", якая знаходзіцца ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы, 16 лістапада адбылося адкрыццё выстаўкі карцін Пётра Гагана, прымеркаванае да пяцідзесяцігоддзя з дня нараджэння мастака. Мерапрыемства ўдастоілі сваёй прысутнасцю паэт Віктар Швед, які прысвяціў юбіляру верш з віншаваннямі, і Рышард Патэр, аўтар кніжкі *Гісторыя спорту ў Гайнаўцы*. У ходзе ўрачыстасці можна было купіць кніжкі абодвух гасцей. Выступаючы перад гайнавянамі Віктар Швед успамінаў сваё дзяцінства ў Моры і сувязях з Гайнаўшчынай.

Вядучая тэма карцін Пётра Гагана — Белавежская пушча і яе наваколле. Выканаў ён многа прыгожых прац з краявідамі Гайнаўшчыны. На алейных карцінах, пастэльных і акварэльных работах можна ўбачыць многа прыроды. Побач пушчы на палотнах красуюцца краявіды Ялты, Кастрамы і іншых мясцовасцей, у якіх пабываў гайнаўскі мастак. Выканаў ён таксама партрэты сваіх сямейнікаў, знаёмых і напісаў ікону Збавіцеля, якая змешчана ў покуці выстаўкі.

— Пётр Гаган — выдатны мастак, непаўторная індывідуальнасць. Адлюстроўвае свет у рэалістычным вобразе, а яго карціны прасякнуты далікатным колерам і аптымізмам, — адзначыў Віктар Кабац, які адкрыў выстаўку.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Герой мерапрыемства і яго госці (злева): Рышард Патэр, Пётр Гаган, Святлана Хандусь і Віктар Швед

Вакальныя ўмеласці

У VII Конкурсе дзіцячай песні „Z nutką za pan brat", арганізаваным 16 і 17 лістапада ў Гайнаўскім доме культуры, выступілі 60 выканаўцаў з Падляшскага ваяводства, а сярод іх вучні бельскай „тройкі" і гайнаўскай белгімназіі.

Камісія (Януш Папай з Беластоцкага радыё, гайнаўскі музыка Бернард Беняконскі і заснавальніца „Чарамшыны" Барбара Кузуб-Самасюк) выбрала 20 выканаўцаў да ўдзелу ў гала-канцэрце 17 лістапада. Сярод гімназістаў першае месца здабыла Амелія Горбач з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, другое — Сільвія Тарасюк з Гімназіі н-р 9 у Беластоку, а трэцяе — Віялета Аліфярук з бельскай „тройкі". У групе вучняў падставовых школ перамог калектыў „Студыя песні" з Бельскага дома культуры, другое месца заняў калектыў „Журавінка" з бельскай „тройкі", а трэція месцы — вучні з Нараўкі і Орлі. Сярод салістаў з падставовых школ першае месца заняў Адрыян Цвалінскі з ПШ н-р 5 у Гайнаўцы, другое — Караліна Пажазінская з ПШ н-р 5 у Бельску, а трэцяе Юльяна Дораш з калектыву „Журавінка", вучаніца ПШ н-р 3 у Бельску.

Барбара Кузуб-Самасюк паінфармавала, што сёлетні ўзровень конкурсу быў вельмі высокі. Аднак не ўсе выканаўцы падабралі адпаведны дзіцячы і маладзёжны рэпертуар. Некаторыя ўдзельнікі звярталі вялікую ўвагу на танец, што было незразуменнем ідэі конкурсу, які меў вакальны характар.

(ам-з)

Віктар Швед

Дарагому Пятру Гагану ў яго творчы бенефіс

Сто гадоў — век поўны чалавека,
Да яго імкніся, Дружа мой.
Пяцьдзесят — вядома што паўвеку,
Гэта Ты ўжо маеш за сабой.

І табе ў другой жыцця палове
Хочацца мне шчыра пажадаць
Многа шчасця, добрага здароўя
І каштоўнасці мастацкія ствараць.

Табе многа творчага натхнення,
Уражлівасці на прыродны свет,
Як найболей творчага гарэння,
Мастак — таксама ж у душы паэт.

Падвойнае мы адзначаем Свята,
Сёння ж і Твой мастацкі бенефіс.
Прадставіў Ты нам, Дружа, плён багаты,
Які паддаў пад творчы аналіз.

А на сцяне, што над кватэрным ложкам,
Сваёю сінявокаю красой
Мяне натхняюць сімвалы-валошкі,
Тваёю уваскрэшаны рукой.

За незалежнасць — да канца

Дом Уладзіміра Жылкі з'явіўся на нашым шляху нечакана. У Макашах, вёсцы непадалёк Міра, мы распытвалі пра дарогу ў Мядзведку.

— Што *гэто* за табліца такая? — пацікавіўся Вячаслаў, і мы ўсе за ім... Дошка на вясковай хатцы і на беларускай мове?

— Тут нарадзіўся і жыў Уладзімір Жылка, — прачытаў уголас Вячаслаў.

Насупраць, за жалезнай агароджай і кустамі бэзу, мы прыкмецілі мемарыяльны помнік у гонар паэта.

— Жылка родам з Макашоў, — прыгадалі мы ўраз. Ашаломленыя адкрыццём і шчаслівым здарэннем, вырашылі тут спыніцца.

Наш шафёр, які не чуў пра такога, крыва ўсміхаўся:

— А ёлкі-палкі! — кінуў у наш бок. — Ведзь вам жэ в Медзьведку нада...

* * *

Уладзімір Жылка свядома працягваў місію Багдановіча. Будаваў масты паміж беларускай глухаманню і еўрапейскім парнасам. На працягу кароткага жыцця праявіўся як паэт, літаратурны крытык, перакладчык, рэдактар часопісаў, грамадскі і палітычны дзеяч, настаўнік.

Нарадзіўся 27 мая 1900 года ў сялянскай сямі'і. Бацька будучага паэта працаваў прадаўцом у манапольнай і царкоўнай краме. Першую адукацыю Уладзімір Жылка атрымаў у гарадскім вучылішчы ў Міры.

Вось як у пачатку стагоддзя пісаў пра Мір Напалеон Роўба:

— Мір, старажытнае мястэчка ў Навагрудскім павеце над ракой Міранкай, 45 вёрст ад Навагрудка, 16 вёрст ад Гарадзеі што на чыгуначнай лініі Масква — Бярэсце, 105 вёрст ад Мінска. Зямля ўрадлівая. Жыхароў каля 800 асоб. Валасная ўправа, вясковая школа, шпіталь, пошта, аптэка. У мінулым панавалі тут Ілінічы, яны пабудавалі замак, каб атрымаць тытул графаў. Пасля іх Мір належаў Радзівілам, а ў 1892 г. купіў яго князь Святаполк-Мірскі, атаман казакаў. Руіны замка, наколькі дорага, настолькі безгустоўна, аднавіў. А шкада, гэта і ёсць самавітая гатычная будоўля з пяццю вежамі...

У Макашах Уладзімір Жылка пражыў да 1914 года. У вершах прасякнутых рамантычным духам сустрэнем сляды старажытных руінаў, зварот у мінулае. Невыпадкова — вёска Макашы знаходзіцца на шляху між старажытным Мірам і Ішкалдзю, дзе легендарны гатычны касцёл XV стагоддзя.

* * *

Ідзем на панадворак да Уладзіміра Жылкі.

— Добры дзень! — вітаемся з жанчынай, якая выйшла нам на спатканне.

— Здрасце! — усміхаецца гаспадыня.

— Вы, пэўна, сваячка Жылкі?

— Ой, не, не... мы дачнікі.

— Здалёк?

— Здалёк, аж з-за Масквы.

— Як вы трапілі ў Макашы?

— Мы — ваенныя. Зараз у Беларусі жывем, у Мінску.

Савіна Наталля Сяргееўна запрашае ў хату. У былой святліцы зараз салон. У кухні на хлябной печы сушацца грыбы.

— Дому 150 гадоў, — кажа гаспадыня, — калі куплялі, быў *хуже сарая.*

Раней тут была школа, магазін, жылі дзве сям'і. Доўгі час дом пуставаў і нішчэў.

Вёска Макашы ажывае летам, калі з'язджаюцца дачнікі. З мясцовых — як сказала Наталля Сяргееўна — асталіся адны *старыкі і старухі.*

* * *

Паэт, Уладзімір Жылка, малавядомы ў Беларусі. Афіцыйна мяркуецца, што яго творчасць цяжкая для засваення вучням. Справа ў іншым. Вершы Уладзіміра Жылкі глыбокапатрыятычныя. Паэт прапаведаваў ідэю змагання за незалежнасць Беларусі да канца.

У 1914 годзе сям'я будучага паэта апынулася ў Тульскай губерні. Уладзімір працягваў вучобу ў Багародзіцкім агароднічым вучылішчы. У час рэвалюцыі вярнуўся ў Мінск, дзе пазнаёміўся з Купалам, Бядулем, Чаротам, Родзевічам, звязаўся з тэатральным калектывам „Беларускай хаткі". Палітычныя ягоныя сімпатыі былі на баку левых эсэраў, супрацоўнічаў з кіраўніком БРА Леапольдам Родзевічам і братамі Канчэўскімі.

З 1921 г. вучыўся ў Карлавым універсітэце ў Празе на гісторыка-філалагічным факультэце. Разам з Ігнатам Дварчаніным заснаваў Асацыяцыю беларускіх прагрэсіўных студэнтаў, выдаваў часопіс „Перэвесла", „Прамень", „Наш прамень". У 1926 г. вярнуўся ў Мінск.

* * *

Дом паэта адшукалі цераз Англію. Тры гады таму.

— У Лондане, у архівах была знойдзена фатаграфія Жылкі на фоне хаты, — кажа Наталля Савіна. — А ў Мінску жыве яго ўнук. Ён і дапамог знайсці гэтае месца. Прыехалі да нас, пыталі, параўноўвалі.

На сцяне ашаляванай хаткі беларускамоўная табліца:

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дом Уладзіміра Жылкі ў Макашах

У гэтым доме 27 мая 1900 года нарадзіўся і жыў да 1914 года беларускі паэт, перакладчык, крытык Уладзімір Адамавіч Жылка (1900-1933).

— Ці хтосьці яшчэ цікавіўся паэтам?

Наталля Савіна прыгадала візіт даследчыка Міхася Скоблы, які падарыў зборнік вершаў. Цяпер кніжка ляжыць у салоне, на ганаровым месцы.

Насупраць, метраў пяцьдзесят ад дома, мемарыяльны помнік з партрэтам паэта. Тут Жылка выступае як „беларускі савецкі паэт". Помнік аздоблены надмагільным пластмасавым вянком з жоўтых руж ды агароджаны жалезнай сеткай.

Да нас, як на заклік, збегліся вясковыя дзеці. Басаногія і цікаўныя.

— Ведаеце, каму гэты помнік?

— Ведаем! — гукнулі хорам. — Тут пахаваны наш паэт.

* * *

Магіла Уладзіміра Жылкі далёка ад родных Макашоў.

Пасля вяртання з Прагі ў Мінск паэт уключыўся ў працэс беларусізацыі. Працаваў з творчай моладдзю, за што прыдбаў сабе канфлікт з верхаводамі „Маладняка" і БелАППа. У выніку змовы хворы на сухоты паэт быў сасланы на пасяленне ў Уржум Вяцкай губерні. Памёр на трыццаць трэцім годзе жыцця. Яго імя было змоўчана ў савецкі час.

Уладзімір Жылка пакінуў багатую спадчыну — зборнікі паэзіі: „Уяўленне" (1922), „На ростанях" (1924), „З палёў Заходняй Беларусі" (1926), крытычную і перакладчыцкую літаратуру. Перакладаў Бадлера, Ібсена, Блока, Міцкевіча, Лермантава.

Свядома працягваў беларускую вызваленчую легенду. Сваім любімым паэтам і духоўным песняром маладой беларускай нацыі лічыў Янку Купалу.

Як піша Уладзімір Калеснік, Жылка як бы знарок быў пасланы ў свет беларускай паэзіі, каб сваім лёсам і словам выявіць яго геаграфічныя і эстэтычныя абсягі*.

У Макашы, вёску над жывапіснай рэчкай Ушай, дзе пейзаж пазначаны старажытнымі помнікамі мінулага.

Ганна Кандрацюк

**Ростані волі — З заходне-беларускай паэзіі*, „Мастацкая Літаратура", Мінск 1990.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Помнік паэту ў Макашах

Юбілей „Цаглінак"

25 гадоў з беларускай песняй

23 лістапада г.г. самадзейны фальклорны калектыў „Цаглінкі" са Старога Ляўкова (Гайнаўскі павет) святкаваў 25-годдзе сваёй мастацкай дзейнасці. Ён з'яўляецца адным з найактыўнейшых на Гайнаўшчыне. Яго музычны кіраўнік — Мікалай Мяжэнны з Гродна. Прыязджае ў Ляўкова ўжо адзінаццаць гадоў. Дзякуючы яму „Цаглінкі" павышаюць свой мастацкі ўзровень. У музыцы шукаюць яны не банальных модных рытмаў, а сур'ёзных тэм, глыбокіх мелодый і грунтоўнай духоўнай ёмістасці.

На працягу сваёй 25-гадовай дзейнасці ляўкоўскія „Цаглінкі" заваявалі сэрцы шырокага кола аматараў музыкі. Калектыў — шматразовы лаўрэат конкурсу „Беларуская песня", аглядаў аматарскага руху сеніёраў ды сустрэч абрадавых калектываў і калядоўшчыкаў. У яго рэпертуары вялікая колькасць песень. Калектыў выпусціў аўдыёкасету з запісам найбольш яркіх сваіх мелодый. Усе яны выконваюцца і задушэўна, і звонка, і мілагучна.

Ядро гурту састаўляюць: Вера Осяк, Надзея Кабаць, сёстры Вера Сват і Ніна Рэент, Ірэна Мірановіч і Марыя Русіновіч. Кіраўнік — Ірэна Лапінская.

„Цаглінкі" маюць вялікую дапамогу войта гміны Мікалая Павільча, дырэктара Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы Андрэя Скепкі і дырэктара Прадпрыемства будаўнічай керамікі ў Старым Ляўкове — Аляксандра Бандарука. Разуменне патрэб і канкрэтная дапамога дадаюць калектыву новых сіл. А спеў ляўкоўскіх „Цаглінак" захапляе сэрцы слухачоў. У рэпертуары шмат цудоўных беларускіх песень. Прыгожыя ў іх народныя касцюмы.

З юбілеем калектыў віншавалі намеснік консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандр Харытонаў, старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі, намеснік дырэктара Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ў Беластоку Барбара Пахольская, старшыня Рады гміны ў Нараўцы Славамір Кулеша. Былі зачытаны шматлікія віншавальныя лісты, у тым ліку ад падляшскага ваяводы Марка Стшалінскага ды паслоў Падляшскага ваяводства.

У мастацкай частцы выступілі юбіляркі, „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага, „Нараўчанкі" з Нараўкі і капэла з Дубін. Канцэрт працягваўся дзве гадзіны. Госці маглі паглядзець кароткаметражны кінафільм «25 гадоў „Цаглінак"».

З нагоды 25-годдзя працы калектыву на культурнай ніве да віншаванняў далучаецца таксама рэдакцыя „Нівы".

Янка Целушэцкі

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Януш Сейбук, уласнік цырка „Баяра”

Трымае нас толькі запал

Ад некалькіх гадоў — чаго не было раней — вялікія цыркавыя шатры можна сустрэць нават у вёсках Падляшша. З Янушам СЕЙБУКАМ, выпускніком Дзяржаўнай студыі цыркавага мастацтва ў Юлінку, цяпер дырэктарам цырка „BOJARO”, гутарыць Міхал Мінцэвіч.

— Колькі гадоў працуеце з цыркам?

— З цыркам працую з 1977 года. Спярша быў я штатным артыстам, пасля працаваў на свой прыватны рахунак выязджаючы на замежныя кантракты, працаваў у адміністрацыі цырка „Карона”, а ад трох гадоў разам з супольніцай вяду свой цырк „Баяра”. На арэне быў я эквілібрыстам, трымаў падставу акрабатычнай піраміды, а таксама жэрдку на плячы або галаве, на якую ўваходзіла партнёрка.

— Чаму сёння цырк выступае ў малых мясцовасцях, як, напрыклад, Орля?

— Раней, перад трансфармацыяй, за адзін сезон наш цырк наведваў 14 гарадоў; у адным горадзе стаялі два тыдні або месяц. Тады ў горад прыязджалі людзі з вёсак і мястэчак, а сёння маецца наадварот. Сёння намножылася цыркаў: калі пры камуне было сем дзяржаўных, дык цяпер маем 25 прыватных. І паменшаў лік гледачоў, нягледзячы на тое, што мы ездзім у малыя мясцовасці і ў жылыя кварталы вялікіх гарадоў, каб людзям было бліжэй.

— Ці ў польскіх цырках выступаюць мастакі з Беларусі?

— Апрача 25 польскіх цыркаў у нашай краіне выступаюць 3-4 чэшскія цыркі. Некалькі гадоў назад у нас было нашэсце чэшскіх цыркаў, мо з 50 іх гастралявала. Гэта малыя сямейныя прадпрыемствы. З Польшчы яны пераехалі ў Беларусь і Украіну, таму што і ў сябе яны не могуць на сябе зарабіць; сёння яны ездзяць аж у Цэнтральную Азію. З 450 мастакоў дзяржаўнага цырка сёння асталося ў ім адно 30-40, апошнія — гэта імпарт з Расіі, Украіны і Беларусі. З постсавецкіх краін акурат Беларусь мае не надта многа мастакоў. У маім цырку выступаюць артысты нават з Манголіі (на здымку). Па людзей сягаем штораз далей на ўсход, бо там яшчэ існуюць дзяржаўныя цыркі, там вядзецца навучанне мастакоў, ёсць умовы для іх развіцця. У Польшчы ўсё гэта на практыцы спынілася. Зводзяцца большыя, дзесяціасабовыя, групы акрабатаў, а на іх месцы паўстаюць групы для выканання адна-двухасабовых нумароў. Гэта вымушае эканоміка. Няма ўжо цыркавай школы ў Юлінку, а ад трох гадоў па прынцыпе нядзельнай школкі існуе ў адной з пачатковых школ Варшавы толькі цыркавае звяно.

— Ці ў нашай краіне цыркавае мастацтва з'яўляецца сямейнай традыцыяй і як гэтыя справы выглядаюць, напрыклад, у Беларусі?

— У калектыве здараюцца сужонствы цыркавых мастакоў. Цырк, гэта не прафесія, але спосаб на жыццё. І адукацыя дзяцей найлепш адбываецца акурат у сям'і. У польскім цырку нямногія дзеці пайшлі слядамі бацькоў: на 450 мастакоў мо толькі 5-6 іхніх дзяцей наследуюць працу ў цырку. У суседніх краінах гэта выглядае інакш, там было пераемства і большасць тамашніх артыстаў прадаўжае працу сваіх бацькоў.

— Ці цырк сёння з'яўляецца рэнтабельнай фірмай і чаму варта — паводле Вас — хадзіць у цырк?

— Жывем у такой дзіўнай краіне, у якой вельмі цяжка дабіцца фінансавага поспеху. Калі чалавек прымушаны да самастойнай вытворчасці і продажы — а так выглядае ў нас цыркавая дзейнасць, — і нашу праграму прапануем у мясцовасцях, дзе беспрацоўе падыходзіць пад 40%, дык цяжка дабіцца фінансавага поспеху. Нас трымае толькі запал.

Калісь сезон пачынаўся ў сакавіку, а канчаўся ў кастрычніку — такое было рашэнне вярхоў. Сёння эканоміка вымушае на нас ранейшы пачатак і пазнейшае заканчэнне. Рэкардсмены стартавалі 15 лютага, некаторыя ўжо закончылі сезон, а мы пацягнем яшчэ месяц. Калісь не было такой тэхнікі — ацяплення тэрмавентылятарамі шатроў, але апрача цырка было шмат працы на эстрадзе, у гастраномах і амаль кожны мастак дарабляў у зімовы перыяд. Сёння гэтага няма, але нягледзячы на вялікую канкурэнцыю, напр. камп'ютэра, якая адцягае крыху цыркавую публіку — думаю — на галашэнні яшчэ зарана.

Ёсць краіны, дзе ў цырк ходзіць і моладзь, і дарослыя. Польскі глядач, гэта старэйшая асоба з дзіцём да васьмі гадоў. Можа гэтая польская трансфармацыя спарадзіла такія абставіны. Аднак гарантую, што цырк можа развесяліць людзей рознага ўзросту, усіх пакаленняў. Цырк з'яўляецца выдатным і старадаўнім мастацтвам, якое ў кожным уражлівым чалавеку выкліча ўзнёслыя пачуцці, захапленне, задуму, радасць.

— Дзякую за размову.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Аюн, 12-гадовая „дзяўчына-гума” з Манголіі, са сваёй настаўніцай Бат Цэк Цэк. Дзяўчынка неўзабаве выступіць на фестывалі маладых мастакоў у Францыі

Фота АДЫ ЧАЧУГІ

Пераможцы — „Лодка вікінгаў”

Беларускі „трактар” — па зямлі і па вадзе

Лета праляцела як бачыш, а тут ужо і восень канчаецца. Прыемна глянуць на летнія здымкі, паўспамінаць. Мне сёлета давялося пабываць у горадзе Аўгуставе на небанальнай імпрэзе — на конкурсе плавання „на абы-чым”. І тут былі беларусы! Але пра гэта крыху ніжэй.

Былі гэта ўжо сёмыя міжнародныя спаборніцтвы ў Аўгуставе. У мінулым годзе ўдзел у іх узяло 35 плаваючых адзінак. Сёлета, хаця мела быць іх больш, то прыехала толькі пятнаццаць, ды і тое адзінка ў выглядзе так званага „гарбуна” (стары „Volkswagen”) — утапілася. „Гарбун” апусціўся на дно, а „маракоў” журы парадавала ўзнагародай пацяшэння.

Замала сёлета было грошай, спонсараў, якія падтрымалі б гэта мерапрыемства, але і так глядзець было на што. Рака Нэтта ўмомант ажывілася, расцвіла, як толькі паявіліся на ёй першыя плаваючыя аб'екты.

Улады горада Аўгустава, колішняй Меккі турыстаў, робяць што могуць, каб неяк выйсці з імпасу. Пацішэла тут у апошнія гады. Папусцела ў рэстаранах і гатэлях. На пляжах месца — хоць адбаўляй. І ўсё гэта нягледзячы на тое, што ўжо тры гады можна тут ездзіць на водных лыжах, што ад мінулага года дзейнічае Цэнтр спорту і адпачынку, дзе ёсць басейн з трамплінам, саўна, з'язджальня, дзе можна прыняць водны масаж і г.д.

Спаборніцтвы па плаванню „на абы-чым” сталі вядомыя не толькі ў Польшчы, але і ў Еўропе. Галоўнае — каб тое „абы-што” пабудаваць сваімі рукамі і каб праплыло яно не менш чатырохсот метраў. Фабрычныя вырабы не дапускаюцца да конкурсу.

Першае месца ў спаборніцтве заваявала лодка вікінгаў „Mauritius II” з Адалянава ў Вялікапольшчы. Выканана яна была з драўніны і вікліны і па форме напамінала сапраўдную лодку вікінгаў. Важыла яна чатыры тоны, а даўжыня яе была дванаццаць метраў. У лодцы сядзеў экіпаж „вікінгаў”,

Другое месца заняла „Плаваючая драбінчастая фурманка” з Кендзяжына-Козля. Дачка, дзяўчынка гадоў васьмідзесяці, сядзела на кані, які „цягнуў” „фурманку з сенам”, бацька, як сапраўдны жанец, сядзеў на сене, а момантамі выходзіў аднекуль збоку. Усе думалі, што воз „цягнула” яго жонка, якая сядзела ў стозе сена, але пасля на сцэне чалавек прызнаўся, што там быў яго добры сябра, які быў „маторам”.

Трэцяе месца журы (у якім быў нават міністр замежных спраў РП Владзімеж Цімашэвіч) прысудзіла „гушкалцы” з Любліна. Там сядзеў толькі адзін чалавек, а трэба было раз націснуць на адзін бок дошкі, раз — на другі. Бедалага! Рухаўся гэты аб'ект на вадзе надта паволі. Язда ажывілася толькі тады, калі „капітан” запрасіў з берага двое дзяцей, якім ён пасля дзякаваў са сцэны.

А з Чаромхі Віктар Шатыловіч прывёз „Беспрацоўны млын”. Тэма вельмі актуальная: у гэтым млыне нічога не малолася, але круцілася кола.

А вось жа і прыбіральня, а як жа, з сэрцайкам, пад назвай „Магутнасць біягазу”. З Любліна. Некаторыя нават задавалі пытанне, ці не адкрывае яна новых магчымасцей для энергетыкі...

Былі і іншыя, хаця б „Апошняя дошка ратунку” — чалавек у надзьмутым нейлонавым мяшку, які цягнула маторная лодка. Або „Снежка” — плаваючы аб'ект з бляшаных банак фірмы „Снежка”, ці „Плаваючыя касміты” з Чорнай-Беластоцкай.

У апошнюю хвіліну ў спаборніцтва ўключыўся плывак з Беларусі, які ўдзельнічаў у ім ужо ў мінулым годзе. „Плаваючы трактар” з Гродна выплыў без нумара, роўненька, як страла, праплыў па вадзе, атрымаў вылучэнне, пасля чаго спакойна праехаўся па вуліцы Рыбацкай — і след яго прастыў.

Было цікава. Журы і фотарэпарцёры плавалі на гандолах. Выступалі калектывы з усяе Польшчы, у тым ліку „Чарамшына”.

Арганізавала мерапрыемства Беластоцкае радыёвяшчанне супольна з уладамі г. Аўгустава.

Ада Чачуга

Фільмавы вечар

Снежань — час падрыхтоўкі да калядных святкаванняў. Каб зімовыя вечары праходзілі ў больш прыемнай атмасферы, прапаную тры фільмы.

„Галівудскі фінал" (*Hollywood Ending*) аўтарства аднаго з выдатнейшых рэжысёраў і акцёраў Вуды Алена прапаную аматарам камедый. Вуды Ален, які выконвае таксама галоўную ролю, прадстаўляе гісторыю нью-йоркскага рэжысёра, лаўрэата прэміі Оскара, гады росквіту якога даўно ўжо прайшлі. З прычыны яго непрыемнага характару і нахабства ніхто не хоча з ім супрацоўнічаць. Прымушаны жыццём займаецца камерцыйнымі рэкламнымі фільмамі.

Дзякуючы стараанням былой жонкі атрымоўвае прапанову стварыць высокабюджэтны фільм. Спонсарам мае быць новы каханак ягонай жонкі. Але чаго чалавек не зробіць дзеля грошай? Усё, у тым ліку і фільм — вялікую „шміру", якая не павінна ўвайсці на экраны кіно (хаця французы прынялі яго з вялікім энтузіязмам).

Спецыфічнае пачуццё гумару Вуды Алена, спалучанае з яго акцёрскім майстэрствам, з'яўляецца прычынай таго, што „Галівудскі фінал" аглядаецца з зацікаўленнем і ўсмешкай. На экране пабачым яшчэ такіх акцёраў, як Джордж Гамільтан, Тэа Леоні, Дэбра Месінг і Марк Райдл.

„Як гэтае робіцца з дзяўчатамі" (*Jak to się robi z dziewczynami*) — адна з навейшых прадукцый польскага кіно, якая можа спадабацца моладзі. Рэжысёр — Пшэмыслаў Ангерман — прадстаўляе гісторыю маладых сяброў Богуся і Рыся, якія мараць аб грошах і эратычных прыгодах. Найважнейшай ім справай з'яўляецца секс, якому аддаюць усю сваю энергію. Каб падчапіць паненак, пазычаюць відэакамеру і прыкідваюцца рэжысёрамі, якія арганізуюць адбор натуршчыкаў да новага фільма. Паяўляюцца дзяўчаты, якія зробяць усё, каб атрымаць ролю. Аднак праблемы Богуся з эрэкцыяй мяшаюць планы сяброў. А Рысь улюбляецца ў адну з кандыдатак на кіназорку і... рэшту давядзецца вам дагледзець у кіно!

На экране пабачым Радаслава Каіма, Кшыштафа Пралата, Мартыну Вайцяхоўскую, Малгажату Фарэмняк і Артура Барціся.

„Улада агня" (*Reign of Fire*) Роба Баўмана гэта прапанова для аматараў казак аб цмоках ды барацьбе дабра са злом. Фільм гэты можна назваць вобразам пасля апакаліпсіса. Знойдзем у ім адказ, напрыклад, на пытанне чаму прапалі дыназаўры.

Мільёны гадоў таму, калі на Зямлі царылі дыназаўры, дайшло да вялікай вайны паміж імі і цмокамі, якія спалілі сваіх праціўнікаў. Потым пераможцы папалі ў доўгі сон... А калі галодныя драконы прачнуліся, сталі атакаваць людзей. Мала чалавек засталося ў жывых, аднак тыя, якія выратаваліся, становяцца на барацьбу з цмокамі... Як яна закончыцца, пабачце самі!

Паўліна Шафран

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Кацярына Саўчук, Малгажата і Кацярына Барташэвіч, Юстына Пікуцін і Міхаліна Барысевіч з апекуном Тамарай Кердалевіч

Мастакі з Чаромхі

У Гайнаўскім доме культуры 15 лістапада адбылося адкрыццё выстаўкі мастацкіх прац вучняў Гімназіі і Падставовай школы ў Чаромсе, якія займаюцца ў тамашнім Гмінным асяродку культуры. Свае работы прадставіла таксама апякун вучняў і дырэктар ГАК Тамара Кердалевіч. На выстаўцы экспануюцца працы з выявамі звяроў, лесу, кветак, краявідаў, выкананых тэхнікай бацікі, якой чаромхаўскія вучні пачалі займацца ў гэтым годзе. Вучні з Чаромхі ў праваслаўным прыходзе вучацца пісаць іконы, а ў асяродку культуры — малююць, рысуюць, выконваюць вырабы з керамікі і саломы.

Аляксей Мароз

Вер – не вер

Астроне! Сніцца мне, быццам я сяджу на нейкай станцыі. Быццам, гэта вакзал, а я сяджу на вуліцы, на лаўцы. Побач са мною сядзяць нейкія людзі, якіх я не ведаю. Раптам перада мною паявіўся нейкі чалавек. Даволі малады, твар зарослы, а ўся постаць пахіленая, быццам ён маліўся. Жабрак? Бо нечага ён у мяне прасіў, мо грошай... Я яму нічога не дала, а ён зырк на мой чамаданчык, які я трымала ў руках, і вырваў яго ў мяне. Адвярнуўся і нешта з ім робіць. А Божа мой, там жа мой камп'ютэр, мусіць, ён яго разаб'е...

Я пачынаю лупіць гэтага чалавека спачатку нагамі (я сядзела, а ён стаяў), а пасля кулакамі. Ён уцякае, а я — за ім. Стараюся дагнаць яго, але ён бегае хутчэй. Убягаем у будынак, ля якога я сядзела, але гэта ўжо не вакзал, а нібыта школа, а мо бальніца.

Я разглядаюся навокал. Куды ён падзеўся? Ага, тут. Я падбягаю да яго і зноў пачынаю яго біць са злосці. Ён ізноў уцякае, проста растварыўся ў паветры. Ну, як жа я яго злаўлю, думаецца мне. Ён жа і так уцячэ з маім камп'ютэрам, бо тут жа многімі дзвярыма можна выйсці. Я, калі так раздумвала, была ў холе гэтага будынка. Кепскі мой сон, праўда, Астроне?!

Рэня

Рэня! Праўда, што сон невясёлы. Можна нават з упэўненасцю сцвердзіць, што ўсе яго элементы гавораць пра нейкую падсцерагаючую цябе небяспеку, а прынамсі пра непрыемнасці. Хаця ты не бачыла цягнікоў, дык жа сядзела на станцыі (небяспека ў паветры, няўдача). Далей: злодзей — небяспека, страта і варожасць. Біць чалавека ці жывёлу — страта, хвароба, смутак.

Але магу цябе і крыху пацешыць. Пасля ж уся дзея твайго сну адбывалася ў холе школы ці бальніцы. А школа — поспех і сямейная радасць, таксама і бальніца — здароўе і поспех. Значыць, нешта перашкодзіць той небяспецы, мо нехта прыдзе з дапамогай табе.

Астрон

Дарогі і слупы

Пры шашы з Нараўкі ў Гайнаўку, цераз Белавежскую пушчу, стаяць дарожныя знакі з надпісам „przełomy" (ухабіны, выбоіны, патрушчаны асфальт). Ямкі-выбоіны ў асфальце залаталі вясною, але знакаў і таблічак з вышэйзгаданым надпісам не забралі.

* * *

Дзесяткі бетонных слупоў колішняй тэлефоннай лініі стаяць пры асфальтаванай дарозе з Семяноўкі ў Тарнопаль ды з Плянты ў Новае Ляўкова (усе гэтыя мясцовасці ў Нараўчанскай гміне). З іх знялі толькі тэлефонныя правады. Слупы непатрэбныя сувязістам?

(яц)

Валейбольныя спаборніцтвы

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы 8 лістапада адбыўся Павятовы гімназічны чэмпіянат хлопцаў па валейболе. Першае месца занялі вучні Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы, другое — гайнаўскай белгімназіі, а трэцяе — гімназісты з Белавежы. На чацвёртым месцы апынуліся хлопцы з Кляшчэляў, а на пятым — з Нараўкі. У Моньках 20 лістапада вучні гайнаўскай белгімназіі выйгралі матчы з белавежскай і супрасльскай камандамі. Хаця прайгралі з вучнямі з Монькаў, перайшлі ў паўфінал паўднёвай групы Ваяводскага чэмпіянату па валейболе.

У час першага этапу спаборніцтваў І школьнай валейбольнай лігі Падляшскага ваяводства, які 15 лістапада праходзіў у Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, белліцэісты выйгралі з вучнямі II Агульнаадукацыйнага ліцэя з Беластока і прайгралі з беластачанамі з Комплексу сельскагаспадарчых школ. Хлопцы з Комплексу прафесійных школ з Гайнаўкі прайгралі два матчы са згаданымі беластоцкімі камандамі. Сярод белліцэістаў найлепшай ігрой вылучаліся Лукаш Гілеўскі, Адам Шпарло і Адрыян Давідзюк.

— Белгімназісты іграюць добра, але няма вучняў, якія адметна вылучаліся б з ліку іншых. Каманда белліцэістаў сёлета моцна аслаблена. Вучні з аснаўной мінулагодняй каманды закончылі вучобу. Нашай задачай будзе застацца ў І школьнай лізе, — заявіў трэнер школьных каманд белліцэя і белгімназіі Раман Данілюк.

Аляксей Мароз

Залатоўка да залатоўкі

Сабраўся я ў нядзелю наведаць шваграа. Раннім цягнікам паехаў у Падбелле. У Сухавольцах у купэ зайшоў Лявон Ярашэвіч, ураджэнец Кляшчэляў. У Сухавольцах ён ажаніўся, зараз раздзяляе долю пенсіянера на жончынай гаспадарцы.

— А ты і ў нядзелю не сагрэеш месца ў хаце, — жартам кідаю ў бок сябры. — Пэўна на рынак едзеш?

— Жонку падмяніў. У нядзелю адпачыць хоча.

— На базары „Мадро" прадаць можна?

— Як калі. У пятніцу яшчэ лубянку зялёнак жонка прадала. За пятнаццаць злотых.

— А сёння што вязеш?

— Малако, смятану ды сыр дамашняга вырабу. Семечкаў ад дыні жонка наважыла ў фольгавых мяшочках. Па паўкілаграма і ў напалову меншых упакоўках. Па дзесяць злотых за кілаграм абыходзіцца. Мужык, які побач прадаваў, прэтэнзію заносіў, — паясняе суразмоўца, — бо танней прадавала.

— Карысць з гандлю нейкая ёсць?

— Лепшы малы гандаль, чым вялікая рыдлёўка, — канстатуе мой суразмоўца. — Залатоўка да залатоўкі і дзесятак узбіраецца.

У Падбеллі Лёнік дапамагае мне з роварам выбрацца. Развітваемся. Я падаюся ў Дубяжын, а сябра на „Мадро" са сваім таварам.

Уладзімір Сідарук

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Самец павы скардзіцца жонцы:

— З таго часу, як увялі каляровае тэлебачанне, ніхто нават не гляне на мяне.

* * *

— Што сказала твая жонка, калі ўбачыла, як цалуешся з суседкай?

— Уяві сабе, нічога. А гэтыя два пярэднія зубы і так трэба было вырваць.

* * *

Напярэдадні Каляд у вёску людаедаў сярод джунгляў дабіраецца Дзед Мароз з вялікім мяшком на плячах. Ледзь жывы давалокся ў першую хату і стогне:

— Прынёс падарункі.

З хаты выходзіць людаед і радасна ўсклікае:

— Чорт з падарункамі; будзем мець багатую вячэру.

* * *

На лесвіцы сустракаюцца два суседы:

— Здароў! Выбіраешся мо куды-небудзь у водпуск?

— Вядома!

— Ці можна ведаць, куды?

— Яшчэ не знаю; хачу зрабіць сам сабе неспадзеўку.

* * *

Святы Мікалай праціснуўся праз дымнік у дзіцячы пакой, каб пакінуць там падарункі. Аднак заміж дзіцяці ўбачыў там спячую голую і прывабную бландзінку. Стаў ён і рассуджае:

— Калі скарыстаю нагоду, дык не змагу вярнуцца ў неба. Калі гэтага не зраблю, — глянуў ён на свае штаны, — дык не змагу пралезці назад на дах.

Крыжаванка



Гарызантальна: 3. прыстасаванне для распальвання агню, 8. старадаўняя колючая зброя ў выглядзе доўгага дрэўка з вострым металічным наканечнікам, 9. сталіца штата Нью-Йорк, 10. гербавая птушка, 11. прылада для падмятання або парання ў лазні, 13. каўпак для лямпы, 15. уладальнік, 16. сярэднявяковы воін, 20. нямецкі горад між Дрэздэнам і Пірнай, 22. глеба, насычаная прыроднымі солямі, 23. музычны клавішны інструмент, 27. тэлеграфная сістэма, у якой у даны момант сігнал праходзіць у адным напрамку, 29. гульня ў касцяныя пласцінкі з ачкамі, 30. рыба сямейства акунепадобных, 31. дзялянка высечанага лесу, 32. чахол для рэвальвера, 33. паўстанне, мяцеж, 34. метрычная музыкальная адзінка.

Вертыкальна: 1. праём з парогам, 2. пацяпленне зімой, 4. павольная жывёліна з касцяным панцырам, 5. не цётка, 6. участак вялікай прасторы, 7. паслядоўнік індуізму, 12. часовая ізаляцыя хворых, 14. лёгкая спартыўная лодка з закрытым верхам, 16. вузкая паласа, лінія, 17. 2,54 см., 18. брэсцкая была заключана ў 1596 г., 19. саламяны сноп для стрэхі, 21. падраздзяленне пуцявой дыстанцыі, 24. абвостранае адчуванне кіслага ў роце, 25. адсутнасць жадання працаваць, 26. лятучая мыш, 27. трыганаметрычная функцыя, 28. з сярпом у савецкім гербе. (Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца прышлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 43 нумара

Гарызантальна: навука, чынара, маліна, рака, спад, процівагаз, ідал, Мале, бацька, льгота, парода.

Вертыкальна: натура, Кама, Чына, разлад, ліслівасць, капрал, спазма, Іджыль, лебяда, Бата, капа.

Рашэнне: **Бяда жыць навучыць**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

У Літаральных

Пасядалі наўкол квадратнага стала кіраўнікі з Літаральнага аб’яднання. Паставіў галоўны шэф Клічнік перад кожным шклянку гарбаты, на выпадак, калі б перасохла ў шаноўных кіраўнічых ратах.

— Гэта дзеля абагрэву? — дадумаўся Квадрат. — Мне чаю няможна, з цукрам. Мне больш каларыйна трэба. Сакавіта, як у мове. А ты, Дужка, не лапачы так хутка з Коскай, вам, маладым, здаецца, што мы ўсё чуем, калі слухаем.

Коска з шырокай усмешкай збіраўся зноў пекануць штосьці смешнае Квадрату ў адказ, але хутка ўспомніў, што як і з Клічнікам, так нават і з Квадратам з жартамі лепш асцярожна.

— У Інтэрнэце пішуць пра літаральныя „беластоцкія стогны”! — крыўдліва азвалася Дужка, спецыяльна расцягваючы словы, каб Квадрат палапаўся, пра каго гэта яна дачыталася ў Інтэрнэце, адначасова намякаючы на Квадратаву бязглуздасць у электроннай тэхніцы. — І пра еўрапейскія нашы часопісы, усё, панемой, у двухкоссі! І пра клічніказнаўства і клічнікаведы. Зводзяцца з нас тут, захвальнікаў тэксту, кантэксту ды падтэксту. Праўда, пэўна, не з мяне...

— З усімі ты імі піла зялёную гарбату! — азваўся Працяжнік. — А з Вандалам п’еш валяр’янку і фацэцыйную віагру. А нам каву трэба, каб стаць на ногі ў барацьбе за тое, каб людзьмі звацца, нам, з нізкім ціскам крыві.

— Не хвалюйся, Працяжнік, ніхто не скажа, што ў цябе штосьці з ціскам не ў парадку! — зарагатаў Квадрат, як заўсёды, з падтэкстам недазволеным да 18 гадоў.

— Я тут, вось, на гэту справу хачу звярнуць увагу шаноўных калег і нашай маладой сяброўкі Полі Тыкі. На тыя дурныя жарты, віртуальныя ці не, з нашага нашаства. Вось, дарагая Поля, сабраліся мы тут з табою на адмысловым сходзе нашага Літаральнага аб’яднання „Белым снегам, Белым снегам”, каб абмеркаваць тваю здраду.

— А я й пісаць ужо не буду! Нікуды! Нават у шуфляду! — збунтавалася Поля Тыка, а на яе вачах выступілі буйныя слёзы. — Вы не можаце мяне прымушаць пісаць! Не маеце права! Самі сабе пішыце, самі чытайце... Я і ў школу не пайду. На шнуроўку наступлю, упаду, заб’юся, і будзеце плакаць і мяне шкадаваць.

— Можа і праўда, — шкадобна глянула на Полю Тыку Дужка. — Будзеце шкадаваць — ніхто з яе класа не хоча ў наша Літаральнае аб’яднанне.

— А хто з літаральнасці выжыве? Каму яна дасць хлеб? Маладыя думаюць нармалёва, — Квадрат зацягнуўся сваёй кароткай папяроскай і шырока ўсміхнуўся сваімі белымі зубамі. — Вось я, прыкладам, якраз не з яе хлеб ем. Напісаў апошні літаральны тэкст летась 9 кастрычніка.

— Добра, што кароткі быў! — Поля Тыка разышлася на ўсю катушку. — А я пісаць не буду.

— А хто цябе прымушае? — здзівіўся Квадрат. — Хіба ж не спадар Клічнік?

— Я, вось, на гэту тэму. Пісання. І здрады. І дурных, прымітыўных жартаў з высокае паэзіі.

Дужка і Коска пераглянуліся. І іх, хоць час ад часу яны паэты, больш прыцягвае муза ў шортах... Муза жарту. Было ні было, у Вандала за кніжкамі на верхняй паліцы стаіць зялёная пляшачка, пасля якое — мора па калені, „і нам, паэтам”.

Вандал Арлянскі

Падхвосная стратэгія

Мабыць, гэта з-за зімовай бяссонніцы мядзведзь Сандар Жоржавіч перад чарговым сходам уселяснога кіраўніцтва адчуваў аграмадную самоту. Прыйшоў на сход заранёў.

— Нават наша паляна нейкая апусцелая, — прысеў пад дубам у одуме.

Неяк таксама крыху раней заскочыла на паляну сяброўка кіраўніцтва лань Гаўрусіха (жонка вядомага аленя Гаўрухі). Не адразу заўважыла мядзведзя.

— Зусюль на мяне палююць. А я — такая далікатная, гібкая, а спляжыць мяне хочуць, — упусціла слязу, настальгічна разграбаючы капыткам белы покрыў снегу.

З задуменнасці вырвала яе ці то рыданне, ці то рохканне. Глянула ўперад. Гэта рыдарохкаў Жоржавіч.

— Спадар мядзведзь вы мой, вас таксама ахапіла настальгія?

— А-а-а-а там, — цяжка ўздыхнуў мядзведзь. — А што тут і гаварыць? Столькі нарабіўся я дзеля нашага лесу, і для звярыны з-за нашых лясных меж. А тут што? Ніхто мяне не хоча, ніхто не кахае.

— Ну, што вы! Як жа ж гэта так? — лань не магла ўцяміць.

— А так, вось, а так. Напісаў, прасіў нават, хоць, як ведаеце, лань, я не прашуся ў нікога, а з усіх лясоў, ад Франконскага і Шварцвальда, нават па Вацлаўскі — ніхто мяне ў госці не просіць. Кажуць, што я — як слон у складзе фарфору. А я ж — мядзведзь, ай, які там з мяне слон.

Сандар Жоржавіч павесіў голас у задуменні.

— Ясна справа. У нашым жа ж лесе сланоў няма. А калі б раптам былі, дык прапалі б. Вы, Сандар, вы ж такія, ну, такія, такія-не-абы-якія... — Гаўрусіха прабавала супакойваць мядзведжыя думы.

— Дзякую. Добрая з вас лань. Ды што ж мне рабіць? Я ж не пайду на ўступкі, нельга мне падвесці ўселясны мой люд.

— Можа... — уключылася лань. — Даруйце мне смеласць... А каб так запрасіць на частунак вужа Ззянона ды змяю Ссапію? Ды так, каб у іншыя лясы аб гэтым вестка дайшла. Накорміце, напоіце. Ну, так сказаць — пад хвост. Пасля будзе відаць.

— Ну, недурная ідэя. Толькі каб не атрымалася так, што я ім працягваю лапу. Мае гэта выглядаць, быццам выпадкова, ну, што мае парогі заўсёды былі для іх адчынены, толькі што яны не змаглі цераз іх перасмыкнуцца.

У гэты момант апошняя частка ўселяснога кіраўніцтва пачала сыходзіцца на паляну.

— Вітаю вас, дзяцел, — вельмі ж ветліва звярнуўся мядзведзь да свайго найбліжэйшага супрацоўніка Стукача. Дзяцел, здзіўлены пераменай шэфа, расчыніў дзюбу і анямеў.

— Адшукайце, калі ласка, Ссапію і Ззянона, — працягваў Сандар з яшчэ большай ветлівасцю. — Значыць, пакуль што, даведайцеся, дзе яны.

— І ў чэрап! — Стукач спрабаваў апярэдзіць думкі мядзведзя.

— Ніколькі, ласкавы мой дзяцел. Пад волас, значыць, пад хвост, пад хвост.

Стукач скамянеў.

— Ой, збіраецца на ўсё большы мароз, — паспеў толькі падумаць.

МакХолад

ISSN 0546-1960